

ЕПІСКАП СЕРАФІМ ПРА ВЕРУ І МОЛАДЗЬ 8

ВЕРШЫ ПРА ВЯЛІКДЗЕНЬ 10



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 МАЯ 2024 г. СУБОТА № 88 (30222)

# Свята сапраўдных каштоўнасцяў

*Праваслаўным хрысціянам Беларусі*

*Дарагія суайчыннікі!*

*Шчыра віншую вас са святам Вялікадня.*

*Яно ўвасабляе трыумф жыцця над смерцю, перамогу дабра над злом, пакоры і самаахвяравання над усёдазволенасцю і эгаізмам. Святло велікодных дзён нагадвае нам пра вечныя евангельскія ідэалы даравання і спагады, любові і клопату пра блізкіх.*

*Разам са Святым Хрыстовым Уваскрэсеннем адраджаецца і прачынаецца вясна, сэрцы вернікаў напаўняюцца гармоніяй і спакоем. Сёння мелодыя званоў Праваслаўнай Царквы сімвалізуе ўрачыстасць на нашай зямлі сапраўдных каштоўнасцяў хрысціянства, якія збліжаюць пакаленні, выступаюць асновай адзінства беларускага народа.*

*Няхай Божая благадаць дакранецца да вашых душ і сагрэе цеплынёй дамы, а сямейныя сустрэчы падораць шчасце і радасць.*

*Жадаю вам міру, згоды і моцнага здароўя.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**При царкве Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Чыжэвічы Салігорскага раёна ўжо не першы год дзейнічае клас званароў. Званар храма Ігар Цемчын навучае свайму майстэрству вучняў гімназіі № 1 Салігорска, якая супрацоўнічае з храмам. Падлеткі з вялікім задавальненнем наведваюць заняткі, удзельнічаюць у фестывалях званароў і святочных богаслужэннях. Пяцікласнік Эльдар ЧОРНЫ займаецца ў класе ўжо чатыры гады і марыць адзваніць велікодны благавест.**

З першых вуснаў

# «ГЭТА НЕ ПРОСТА ЎРАЖВАЕ, ГЭТА ПРЫСТОЙНА»

## Прэзідэнт даў станоўчую ацэнку папярэднім вынікам праверкі дзяжурных сіл Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны



Фота БелТА.

**За ходам праверкі Аляксандр Лукашэнка назіраў на Цэнтральным камандным пункце Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны.**
**Кіраўнік дзяржавы назіраў за праверкай ад моманту яе пачатку і да самага заканчэння, падрабязна цікавіўся ўсім працэсам, пасля чаго пагутарыў з удзельнікамі мерапрыемства.**

Падводзячы вынікі праверкі, Прэзідэнт адзначыў, што першае пытанне, якое яго хвалявала, каб усё адбывалася аб'ектыўна і сумленна.

«Як ваенны чалавек, магу сказаць, што калі вы праверку арганізавалі сумленна, як гэта належыць, то гэта дастойна, — звяртаючыся да ваеннаслужачых, канстатаваў Галоўнакамандуючы. — Я не служыў у ВПС і ВСА, але бачу, як ажыццяўляецца гэтая праверка, задума яе. Вы выявілі ўсе цэлі, з усімі цэлямі справіліся. Гэта выдатна. Ні адна цэль міма вас не прайшла. Уся Беларусь (гэта відаць у рэжыме рэальнага часу) вамі кантралюецца».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што падчас праверкі дзяжурных сіл па супрацьпаветранай абароне ўсе цэлі былі выяўлены своечасова. «Вы з імі справіліся: дзе трэба — паразілі, дзе трэба — прымусілі да пасадкі, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Вы бачыце ўсё, што робіцца на сумежжы, разведка працуе добра, інфармацыя перадаецца. Малайцы! Адно толькі — калі гэта ўсё нечакана, раптоўна і сумленна. Гэта не проста ўражвае, гэта прыстойна. Будуць вынікі аб'ектыўнага кантролю, тады мы канчаткова падвядзём вынікі ў Міністэрстве абароны. У мяне адна толькі насцярожанасць — каб гэта было сумленна. Раптоўная праверка — значыць ведаюць тыя, каму трэба, а астатнія працуюць, як у ваенны час. Калі гэта так, то малайцы. Гэта нядрэнна!»

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў друку з прафесійным святам — Днём друку.**

• Рэспубліканская акцыя «Іх імёнамі названы студэнцкія атрады» пройдзе 7 мая ў Мінску.

• **Прэм'ерныя паказы дакументальнага фільма «Вызваленне» адбудуцца ў 22 гарадах Беларусі.**

• Да Дня Перамогі 6 і 9 мая «Белпошта» ў выдзеленых аб'ектах паштовай сувязі правядзе акцыю «Адпраў вестку ветэрану».

• **Старадаўні велікодны абрад «Стрылка» правядуць у Драгічынскім раёне.**

# «ГЭТА НЕ ПРОСТА ЎРАЖВАЕ, ГЭТА ПРЫСТОЙНА»

❍ **У тэму**



Як адзначыў у размове з журналістамі **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**, канцэнтрацыя войск НАТА каля нашых граніц па-ранейшаму застаецца высокай. «Мы адзначаем высокі ўзровень правядзення мерапрыемстваў аператыўнай баявой падрыхтоўкі, — паведаміў ён. — Да прыкладу, на сёння на тэрыторыі сумежных з намі краін праходзіць шэсць вучэнняў. У рамках вучэння «Абаронца Еўропы» даволі вялікая колькасць тэхнікі і асабовага складу ажыццяўляе перасоўванне па тэрыторыі еўрапейскіх краін, у тым ліку і авіяцыйная тэхніка. Таму, згодна з рашэннем Галоўнакамандуючага, у рамках раптоўнай праверкі Узброеных Сіл, якая праводзілася, былі правераны дзяжурныя сілы па супрацьпаветранай абароне: як яны выконваюць свае задачы па баявым дзяжурстве, ахоўваючы нашу паветраную граніцу».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах кіраўніка абароннага ведамства, аб выніках пакуль казаць рана: яны падведзены толькі папярэдне. «Але ўжо відаць, што ў цэлым з задачай справіліся, — падкрэсліў міністр абароны. — Дэталёвы вынік будзе крыху пазней. Галоўнакамандуючы паставіў нам задачу, калі праверым матэрыялы аб'ектыўнага кантролю, далажыць яму ўжо канчатковы вынік дадзенай праверкі».

Віктар Хрэнін звярнуў увагу, што ў сучасны абстаноўцы пагрозы могуць сыходзіць і з неба, і з зямлі. «Мы бачым, наколькі змяніліся формы і спосабы вядзення баявых дзеянняў нават па прыкладзе спецыяльнай ваеннай аперацыі, якая праводзіцца на Украіне», — канкрэтызаваў ён. Невыпадкова беларуская армія аснашчаецца самымі сучаснымі комплексамі. Толькі нядаўна на ўзбраенне паступілі самалёты Су-30СМ, верталёты Мі-35М, зенітна-ракетны комлекс С-400 «Трыумф». Як падкрэсліў міністр абароны, у тым ліку гэтая тэхніка забяспечвае ахову дзяржаўнай граніцы ў паветранай прасторы, з'яўляецца гарантам мірнага неба над нашай галавой.



**Камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ** нагадаў, што на мінулым тыдні на пасяджэнні VII Усебеларускага народнага сходу былі прыняты два найважнейшыя стратэгічныя дакументы краіны — Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына. «Наша Ваенная дактрына носіць выключна абарончы характар, — падкрэсліў ён. — Асноўнай абароны любой дзяржавы з'яўляецца супрацьпаветраная абарона».

Па словах камандуючага, праверка дзяжурных сіл Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны была няпростай. «Значна павялічаны састаў дзяжурных сіл, выведзены дадатковыя сілы і сродкі, створана складаная паветраная абстаноўка, — удакладніў ён. — Дадаткова прызначаны паветраныя цэлі авіяцыі не толькі Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны. Гэта былі экіпажы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, органаў пагранічнай службы і ДТСААФ. Усе цэлі былі выяўлены радыётэхнічнымі войскамі і знішчаны зенітна-ракетнымі войскамі на далёкіх граніцах рэальных зон знішчэння. Авіяцыя адпрацавала вельмі добра — знішчыла пастаўленыя цэлі. Таксама былі адпрацаваны практычныя элементы прымусу да пасадкі».

Андрэй Лук'яновіч падкрэсліў, што кіраўнік дзяржавы ўдзяляе вельмі шмат увагі Узброеным Сілам, у прыватнасці ваенна-паветраным сілам і войскам супрацьпаветранай абароны. На ўзбраенне паступае сучасная тэхніка, вырашаецца жыллёвае пытанне ваеннаслужачых, павышаецца грашовае забеспячэнне.

«На баявое дзяжурства ў мінулым годзе заступілі новыя зенітна-ракетныя сістэмы С-400, — канкрэтызаваў ён. — Літаральна некалькі тыдняў таму мы атрымалі другую партыю верталётаў Мі-35М, чакаем чарговую партыю. Таксама закупляем новую тэхніку РТВ: гэта нашы беларускія ўзоры («Раса-РБ», «Усход») і расійскай вытворчасці («Працаўнік»). Адно з асноўных пытанняў — забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, чым і займаемся. Мы беражом мірнае неба».

**Вераніка КАНЮТА.**

Сацыяльны клопат

# Ствараючы свята

## Беларускі Чырвоны Крыж уручыў падарункі ветэранам

**Напярэдадні Дня Перамогі супрацоўнікі і валанцёры Беларускага Чырвонага Крыжа і прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны наведалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з віншавальнымі візітамі і падарылі ім танометры.**

Як адзначыла **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Раманія ЗОРЫНА**, гуманітарныя акцыі Чырвонага Крыжа напярэдадні 9 Мая даўно сталі добрай традыцыяй. Кожны раз яны розныя, але штогод супрацоўнікі і валанцёры імкнуцца стварыць сапраўднае свята для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета ветэранам уручылі «гаворачыя» танометры, якія дазваляюць ім самастойна кантраляваць артэрыяльны ціск.

Усяго плануецца наведаць больш за 1100 ветэранаў па ўсёй краіне.



Фота БелТА.

**Сярод тых, хто атрымаў падарункі, — ветэран Вялікай Айчыннай вайны Станіслаў ДАРАФЕЕЎ, які ў наступным годзе адзначыць стагадовы юбілей. «Калі мяне прызвалі ў армію, мне было ўсяго 17 гадоў, але праз некалькі месяцаў споўнілася 18. Я быў паранены тры разы на Першым і Другім Беларускім франтах: скрозь плячо, у галаву і ў бок. Дзень Перамогі сустрэў у Германіі, а потым служыў да 1950 года. Я прайшоў усю Беларусь пешшу і бачыў, колькі было спалена вёсак. У мяне 15 падзяк. Усё маё жыццё было прысвечана рабоце. Перамагчы нам дапамагала цвёрдая вера. Я не думаў пра смерць і выконваў усё, што належыць», — падзяліўся ўспамінамі ветэран.**

❍ **У тэму**

### Выплаты матэрыяльнай дапамогі ветэранам да Дня Перамогі ў Беларусі завершаны датэрмінова

Матдапамога выплачана 8371 чалавеку: ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, былым вязням канцлагераў, членам сем'яў ваеннаслужачых (партызан, падпольшчыкаў), якія загінулі ў гады вайны.

Агульная сума выплат — больш за 10,5 млн рублёў. Як адзначылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, у юбілейны год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў памеры выплат значна павялічаны. Так, для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны яны склалі ад 2 да 4 тысяч рублёў. У ведамстве таксама падкрэслілі, што ўручэнне матдапамогі праходзіла без фармалізму і ва ўрачыстай абстаноўцы. Удзел у віншаваннях прынялі прадстаўнікі органаў улады і грамадскіх аб'яднанняў, моладзь і навучэнцы.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Ліване заявілі, што «падачка ЕС» на мільярд еўра не вырашыць праблемы з бежанцамі



Вылучэнне Еўрасаюзам 1 мільярда еўра ў якасці дапамогі Лівану, прызначанай на намаганні па барацьбе з незаконнай міграцыяй, не будзе садзейнічаць вяртанню сірыйскіх бежанцаў на радзіму. Такое меркаванне выказаў ТАСС выконваючы абавязкі міністра па справах перамешчаных асоб Ісам Шараф ад-Дзін. «Кіраўнік Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен і прэзідэнт Кіпра Нікас Хрыстадулідзіс прыбылі ў Бейрут, каб ускласці на ліванскія ўлады кантроль за нелегальным перамяшчэннем сірыйцаў праз марскую граніцу на Кіпр, паколькі паток мігрантаў на востраў узрос у апошні час, — адзначыў суразмоўца. — Аднак сума, якую вылучыў Еўрасаюз, нікчэмна малая і не вырашыць праблемы. Гэтая падачка не вызваліць Ліван ад прысутнасці звыш 2,2 мільёна сірыйскіх бежанцаў». Па словах чыноўніка, у Бейруце разлічвалі на карэннае змяненне ў падыходзе ЕС да ўрэгулявання крызіснай сітуацыі, звязанай з перамешчанымі асобамі.

### Калумбія разарвала дыпламатычныя адносіны з Ізраілем



Прэзідэнт Калумбіі Густава Петра заявіў, што так адбылося, бо прэзідэнт Ізраіля, урад «праводзяць генацыд». Аб гэтым паведаміла ТАСС. Петра лічыць, што «калі памрэ Палесціна, загіне чалавецтва». Калумбія не можа «гэтага дазволіць», адзначыў прэзідэнт. Ён таксама заклікаў іншыя краіны далучыцца да іску Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ў Міжнародным судзе супраць Ізраіля, у якім яго ўлады абвінавачваюцца ў здзяйсненні генацыду. З пачатку вайны ў сектары Газа прэзідэнт Калумбіі неаднаразова адзначаў, што Ізраіль здзяйсняе генацыд, заклікаючы краіны свету пакласці канец дзеянням прэм'ер-міністра Біньяміна Нетаньяху.

### Зімбабвэ гатова закупіць мільён тон збожжа для барацьбы з наступствамі засухі



Зімбабвэ гатова закупіць за мяжой мільён тон збожжа для барацьбы з наступствамі найбуйнейшай засухі. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на выступленне міністра інфармацыі Джэнфана Мусверы. «На перыяд да сакавіка 2025 года Зімбабвэ не хапае 1,1 мільёна тон збожжа пры норме спажывання 10 кілаграмаў на чалавека ў месяц, — сказаў міністр. — Зварот да стратэгічных запасаў збожжа, у асноўным пшаніцы, скарачае патрэбнасці ў імпарце. Значныя рэсурсы будуць накіраваны на закупку збожжа на ўнутраным рынку. Акрамя таго, прыватны сектар выказаў гатоўнасць задаволіць патрэбнасці ў збожжы за кошт імпарту 1 мільёна тон у перыяд з красавіка 2024-га да сакавіка 2025 года, калі чакаецца чарговы ўраджай». Як вядома, у пачатку красавіка прэзідэнт Зімбабвэ Эмерсан Мнангагва аб'явіў рэжым нацыянальнага бедства ў сувязі з моцнай засухай. Паводле яго слоў, чакаецца, што харчовая дапамога спатрэбіцца больш чым 2,7 мільёна чалавек.

Мы памятаем!

**На мемарыяльным комплексе «Прарыў» ва Ушацкім раёне ўшанавалі памяць герояў-партызан, якія ў ноч на 5 мая 1944 года пад камандаваннем Уладзіміра Лабанка ажыццявілі легендарны прарыў фашысцкага акружэння. Маштабная патрыятычная акцыя Віцебскай вобласці сабрала каля шасці тысяч удзельнікаў з Беларусі і Расіі.**



# Нацыянальны код Айчыны



Марафон патрыятызму «Прарыў Перамогі», які дзявяты раз праходзіць на гераічнай Ушацкай зямлі, стартаваў з аўтапрабегу «Пераможныя вёрсты». Сёлета акцыя прымеркавана да дзвюх памятных дат — 80-й гадавіны прарыву партызанамі Полацка-Лепельскай варожай блакады і 50-годдзя з дня адкрыцця мемарыяла на месцы крывавай бітвы.



Полацка-Лепельская — адна з найбуйнейшых партызанскіх зон плошчай больш за тры тысячы квадратных кіламетраў. Каб ачысціць свае тылы ад партызан, нямецка-фашысцкія захопнікі ў снежні 1943 года — лютым 1944 года зрабілі пяць безвыніковых спроб. Вясной 1944 года былі распрацаваны дзве карныя аперацыі, амаль 25 дзён ішлі цяжкія няроўныя баі. У ноч з 4 на 5 мая партызанскія атрады на чале з будучым Героем Савецкага Саюза Уладзімірам Лабанком ажыццявілі легендарны прарыў вогненнага кальца, выйшлі з акружэння і вывелі 15 тысяч чалавек мірнага насельніцтва.

Праз 80 гадоў урачыстасці на мемарыяле пачаліся з тэатралізаванага пралогу «Каб памяталі», які падрыхтаваў заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны тэатр «Пілігрым» з Полацка. У рамках правядзення акцыі прайшла перадача капсулы часу з відзапасланнямі жыхароў усіх рэгіёнаў Віцебшчыны нашчадкам. Прысутныя таксама змаглі перанесціся на 80 гадоў таму і ўявіць, якой была бітва на Ушацкай зямлі, калі партызанскія атрады прарываліся праз шчыльнае варожае кальцо. Эпізоды бою прадставілі члены гісторыка-патрыятычнага аб'яднання «Будзем памятаць» з Мінска.

Удзел у абласным мерапрыемстве ўзялі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на чале са старшынёй Ігарам Сергеенкам, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Дзямідаў, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Сяргей Ляўковіч, Ганаровы грамадзянін Ушачаў Уладзімір Андрэйчанка, дэлегацыі Пскоўскай і Смаленскай абласцей, прадстаўнікі арганізацый і ўстаноў паўночнага рэгіёна, моладзь.

Звяртаючыся да прысутных, **Ігар СЕРГЕЕНКА** адзначыў, што мемарыяльны комплекс «Прарыў» з'яўляецца адным з тых месцаў, якое нікога не павінна пакінуць абыякавым. «Бацькі прывезлі мяне сюды, калі комплекс быў яшчэ толькі некалькі гадоў як пабудаваны, але народная сцежка да яго дагэтуль не зарастае. Сёння тут шмат моладзі, кадэтаў, школьнікаў і людзей розных пакаленняў. Пакуль жывая народная памяць аб тутэйшых ваенных падзеях і сюды прыходзяць людзі, будучыня ў нашай краіны ёсць», — адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў.**

«Глыбока сімвалічна, што сёння мы праводзім дні партызанскай славы, прысвечаныя 80-й гадавіне прарыву варожай блакады партызанамі Полацка-Лепельскай зоны. Тым самым тут, на Ушацкай зямлі, дзе пралівалася кроў нашых бацькоў і дзядоў у гады Вялікай Айчыннай вайны, мы аддаём даніну памяці ратным і працоўным подзвігам беларускага народа. Гэта нашы жывыя традыцыі, і яны з'яўляюцца нацыянальным кодам Айчыны. Гэта трэба, як паветра, будучым пакаленням», — падсумаваў **старшыня аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**



# «ЦЯПЕР УСЁ НАПОЎНІЛАСЯ СВЯТЛОМ»

## Пастырскае пасланне на Вялікдзень 2024 года



Узлюбленыя ў Хрысце архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

Добрая вестка пра Уваскрэслага Спасіцеля сёння разносіцца па ўсёй нашай зямлі. Не толькі людзі, але і прырода радуецца Хрыстову Уваскрэсенню, бо «цяпер усё напоўнілася святлом — і неба, і зямля, і пекла» (Пасхальны канон, песня 3).

Яшчэ зусім нядаўна мы ішлі за Госпадам па шляху Яго крыжовых пакут і разам з апосталамі і жанчынамі-міраносіцамі пахавалі Яго Прачыстае Цела, а цяпер разам са свяціцелем Грыгорыем Багасловам усклікаем: «Сёння спасенне для свету, свету бачнага і свету нябачнага! Хрыстос з мёртвых, — паўстаньце з Ім і вы; Хрыстос у славе Сваёй — узыходзьце і вы; Хрыстос з магілы — вызваляйцеся ад путаў граху; адчыняюцца вароты пекла, знішчаецца смерць, адыходзіць стары Адам, паўстае новы».

У спасіцельным прывітанні «Хрыстос Уваскрэс!» выказана сутнасць хрысціянскай веры, аснова нашага спадзявання, сэнс існавання свету і аснова непахіснай надзеі кожнага чалавека. Гасподзь уваскрэс не дзеля Сябе, і Яго перамога над смерцю не была толькі Яго асабістай перамогай. Усё гэта здзейснілася «дзеля нас і нашага дзеля спасення». У чалавечы свет, падпарадкаваны граху, тленню і закону смерці, Ён прыносіць новую закваску, якая пераўтварае ўсю створаную Ім прыроду і назаўсёды адымае ў граху і смерці іх уладу і магутнасць.

«Смерць! дзе тваё джала? пекла! дзе твая перамога?» (1 Кар. 15, 55) — рашуча запытвае апостал Павел. Так, яны яшчэ застаюцца ў нашым свеце, але ўжо не пануюць над намі, бо, паводле слова свяціцеля Феафана Затворніка, «Уваскрэсенне Хрыстова ўявіло новы вобраз быцця, які на ўсё распасціраецца».

Богаслужэнне Святой Пасхі ўрачыста паўтарае словы апостала і святых айцоў: «Смерці святкуем мы ўмярцвенне, пекла разбурэнне, пачатак іншага — вечнага жыцця» (Пасхальны канон, песня 7). У гэтых словах змяшчаецца не рытарычнае перабольшванне, але паэтычна выказаная найглыбейшая дагматычная ісціна, якая глыбока перажываецца ў гэтыя дні хрысціянамі. Уваскрэсенне Хрыстова — гэта пачатак новага жыцця і новай рэальнасці, да якой далучаецца кожны вернік, які жыве паўнавартасным царкоўным жыццём.

У нашым свеце шмат бязладдзя і супярэчнасцяў, трывожныя навіны і чуткі непакояць нашы сэрцы, часта пазбаўляючы нас душэўнага міру і ўсяляючы няўпэўненасць і страх перад будучыняй. Людзі часам задаюцца пытаннем: у чым жа сіла Уваскрэсення Хрыстова, як спалучыць пасхальную радасць з тымі падзеямі, якія адбываюцца на нашай планеце?

На гэтае пытанне адказвае Евангелле, якое чытаем на Пасхальнай літургіі. «У Ім было жыццё, і жыццё было святлом для людзей; і святло ў цемры свеціць, і цемра не агарнула яго» (Ін. 1, 4-5). Грахоўная цемра гэтага свету бяссільная перад Хрыстовым Уваскрэсеннем, яна ўжо ніколі не зможа пагасіць гэтае Святло, «Якое прасвятляе ўсякага чалавека, што прыходзіць у свет» (Ін. 1, 9).

Важна памятаць і іншыя евангельскія словы, звернутыя да кожнага з нас: «Дык няхай свеціць святло ваша перад людзьмі, каб яны бачылі вашы добрыя ўчынкі і ўслаўлялі Айца вашага, Які на нябёсах» (Мф. 5, 16). Менавіта ад нас, хрысціян, ад нашых учынкаў, слоў і нават думак у многім залежыць, наколькі будзе асвечаны навакольны свет святлом Хрыстовай веры, наколькі будзе мяняцца да лепшага.

Уваскрэсенне — гэта не толькі рэальнасць будучага веку, да яго пладоў мы далучаемся ўжо цяпер, жывучы на зямлі. «Устань, хто спіць, і ўваскрэсні з мёртвых, і асвеціць цябе Хрыстос» (Эф. 5, 14), — у гэтых словах апостала Паўла гаворыцца не пра фізічную смерць і ўваскрэсенне, а пра благадатнае духоўна-маральнае змяненне чалавека. Як тлумачыць свяціцель Іаан Залатавуст: «У якім жа сэнсе гэтае Уваскрэсенне? У такім, што грэх умярцвёны, а праведнасць уваскрэсла, старое жыццё скасавана, а пачалося новае — евангельскае».

Але гэтае адраджэнне залежыць не толькі ад добрай волі Бога, «Які хоча, каб усе людзі выратаваліся і прыйшлі да спазнання ісціны» (1 Цім. 2, 4). Наша стараннае выкананне запаведзяў, нашы намаганні ў пераадоленні сваіх недахопаў і дзейсная любоў да бліжняга — вось умовы, пры якіх мы можам увайсці ў радасць Госпада Свайго і ўсёю сваёю істотаю далучыцца да той рэальнасці, пра якую сведчаць Пасхальнае богаслужэнне і святыя ўгоднікі Божыя.

«Калі Бог за нас, то хто супраць нас?» (Рым. 8, 31). Менавіта ў гэтым залог душэўнага міру і непахіснай надзеі. Калі мы жывём з Богам і імкнёмся Яго законы зрабіць законамі нашага жыцця, нішто не зможа адлучыць нас ад любові Божай і пазбавіць радасці Хрыстова Уваскрэсення.

Віншуючы вас, дарагія, са Светлым Хрыстовым Уваскрэсеннем, жадаю, каб святло Хрыстовай любові заўсёды асвячала вашы сэрцы, каб праз нас яно пралівалася на ўсіх людзей, бліжніх і далёкіх. Няхай Гасподзь захавае мір у нашай краіне, ды адновіць мір на Украіне і на Святой зямлі! З радасцю і падзякай прынясём Богу нашы сэрцы і шчырую веру, добрыя справы і дзейсную любоў да бліжніх. І няхай усё наша жыццё, пераўтворанае і асвечанае Божаю благадаццю, ніколі не перастае сведчыць пра вялікую перамогу Госпада нашага Ісуса Хрыста.

Хрыстос Уваскрэс!

**Веніямін,**
**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,**
**Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

Актуальна

# СТЫМУЛ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

## У Беларусі ўступіць у сілу зменены закон аб прадпрымальніцкай дзейнасці

**Як вядома, у канцы красавіка быў падпісаны Закон «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці». Дакумент змяняе саму архітэктуру гэтай сферы. Цяпер ёсць толькі дзве катэгорыі, якія змогуць займацца прадпрымальніцтвам: юрыдычныя і фізічныя асобы. Малымі арганізацыямі сярод юрыдычных асоб будуць лічыцца тыя прадпрыемствы, дзе колькасць работнікаў не перавышае 100 чалавек. Да сярэдніх аднясуць кампаніі да 250 супрацоўнікаў, а да буйных — звыш 250 чалавек. У катэгорыю фізічных асоб уключаны рамеснікі, уладальнікі аграэкасядзіб, самазанятыя і індывідуальныя прадпрымальнікі. Да 1 ліпеня ўрад вызначыць віды дзейнасці, якімі могуць займацца індывідуальныя прадпрымальнікі. Акрамя таго, з 1 кастрычніка будзе спынена рэгістрацыя новых «індывідуалаў» па відах дзейнасці, якія не ўнясуць у пералік.**

Згодна з новым законам, да 1 студзеня 2026 года ўсе дзейныя індывідуальныя прадпрымальнікі, якія не ўвойдуць у названы пералік, абавязаныя стаць юрыдычнымі асобамі. Пры гэтым для іх уводзіцца спрошчаны парадак пераходу ў камерцыйныя арганізацыі з пераемнасцю па ўсіх правах і абавязацельствах перад бюджэтам і контрагентамі.

### Каля 40 тысяч ІП

З моманту ўступлення асноўных нормаў гэтага закона будзе прадугледжаны шэраг навацый. Пытанні рэгулявання знаходзяцца ў сферы прадпрымальніцкай дзейнасці, сацыяльных і працоўных адносін, а таксама фінансаў, адзначыў **намеснік міністра эканомікі Уладзімір НАВУМОВІЧ:** «Законам будуць вызначаныя новыя катэгорыі. Так, суб'екты гаспадарання будуць аднесены да малога і сярэдняга прадпрымальніцтва».

Да 8 мая абмяркуюцца ўсе прапановы органаў дзяржаўнага кіравання і мясцовых выканаўчых органаў па форме і аб'ёму напаўнення дазволенымі відамі дзейнасці для ІП. 15 мая дадзеныя пералікі будуць размешчаны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале для грамадскага абмеркавання і фарміравання іх канчатковага аб'ёму. Паводле яго слоў, да 1 ліпеня пастановай урада для індывідуальных прадпрымальнікаў будуць устаноўлены пералікі, у дачыненні да якіх прадпрымальнікі змогуць ажыццяўляць сваю дзейнасць.

Уладзімір Навумовіч дадаў, што, на думку Міністэрства эканомікі, пытанне рэгулявання закране каля 40 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. Паводле звестак Белстата, на 1 красавіка ў Беларусі налічвалася амаль 250 тысяч ІП. З іх большая частка, а гэта 34,4 %, занятыя ў гандлі.

«Законам будзе прадугледжаны механізм бясшвовага пераходу з формы індывідуальнага прадпрымальніка ў форму юрыдычнай асобы з захаваннем адпаведных правоў і абавязкаў. У законе таксама знайшлі адлюстраванне новыя формы падтрымкі прадпрымальнікаў у выглядзе трансфертаў і іншых механізмаў», — звярнуў увагу Уладзімір Навумовіч.

### Павысіць аддачу, але без залішняга фіскальнага ціску

Тыя нормы, якія знайшлі адлюстраванне ў законе, ужо даўно наспелі. Так, большая частка гэтага дакумента ўносіць змены ў дзейныя заканадаўчыя акты, заявіў **першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО.** У сувязі з лібералізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці ў апошнія гады з'явіліся новыя арганізацыйна-прававыя формы — самазанятыя. Гэтыя людзі маглі ажыццяўляць сваю дзейнасць без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. У Міністэрстве фінансаў эвалюцыйна падышлі да таго, што індывідуальная прадпрымальніцкая дзейнасць у Беларусі будзе дазваляць рэалізоўваць прадпрымальніцкі патэнцыял чалавека, прычым пачынаючы з простых формаў, якія не патрабуюць адміністрацыйных умяшанняў або падатковага рэгулявання.

Дзмітрый Кійко дадаў, што рост у самазанятых да індывідуальнага прадпрымальніка дазволіць прыцягваць наёмных работнікаў, але будзе ажыццяўляцца па пэўных відах дзейнасці. У перспектыве магчыма маштабаванне і да ўзроўню камерцыйнай арганізацыі.

«Мы лічым, што такі падыход цалкам апраўданы, паколькі ён ліквідуе залішнюю канкурэнцыю паміж прававымі формамі, — адзначыў Дзмітрый Кійко. — Раней самазанятыя канкурыравалі з індывідуальнымі прадпрымальнікамі, а індывідуальныя прадпрымальнікі — з арганізацыямі па відах дзейнасці, якія перасякаюцца. Гэты закон рэгламентуе падобныя пытанні і арганізацыйна-прававыя формы. У выніку без залішняга фіскальнага ціску і адміністрацыйнага рэгулявання будзе павышана аддача суб'ектаў малога прадпрымальніцтва ў фарміраванні бюджэту краіны».

Паводле яго слоў, работа па арганізацыйна-прававых формах адначасова ажыццяўлялася ў сумежным заканадаўстве, у прыватнасці рэфармаваліся падыходы па падаткаабкладанні. Дзякуючы ім з'явіліся такія новыя рэжымы, як падатак на прафесійны даход, што рэалізуецца з дапамогай лічбавай платформы.

«За апошнія два гады ўклад суб'ектаў малога прадпрымальніцтва ў фарміраванне даходаў бюджэту павысіўся на 600 мільёнаў рублёў — гэта досыць вялікія лічбы з улікам таго, што паступленні ад малога прадпрымальніцтва ў нас фарміруюць мясцовыя бюджэты. У сувязі з гэтым мы пазітыўна ацэньваем новы закон і мяркуем, што мэты, якія пераследуюцца, будуць дасягнутыя», — падсумаваў Дзмітрый Кійко.

### Стварыць умовы

У развіцці закона аб рэфармаванні прадпрымальніцкай дзейнасці галоўнае — стварыць умовы, у якіх ІП будуць разумець, як можна далей развівацца і які выбраць аптымальны шлях гэтага руху, заявіў **намеснік міністра па падатках і зборах Уладзімір МУКВІЧ.** «Хачу звярнуць увагу, што па законе маецца магчымасць урэгуляваць шэраг пытанняў, якія могуць быць звязаныя з развіццём бізнесу і яго пераходам у камерцыйную арганізацыю. У сувязі з гэтым ёсць неабходнасць прадастаўлення падатковай дэкларацыі да закрыцця ІП і прыняцця неабходных мер, напрыклад, у дачыненні да бланкаў і сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення падатковага кантролю. Калі такія дзеянні будуць прыняты ў тыя тэрміны, якія вызначае закон, то мяркуем, што на індывідуальнага прадпрымальніка будзе мінімальная нагрузка, пры гэтым будзе вырашаны шэраг пытанняў», — падкрэсліў Уладзімір Муквіч.

Намеснік міністра адзначыў, што ёсць камерцыйныя арганізацыі, якія сутыкаюцца з няроўнай канкурэнцыяй. Так, многія плацельшчыкі злоўжываюць тымі рэжымамі і ўмовамі, якія былі для іх створаны на першасных этапах развіцця нашай краіны. Трэба рабіць далейшыя крокі, каб здзейсніць усё цывілізавана і не дапускаць перакосаў. Колькасць незаконных схем, якія ўзніклі з выкарыстаннем статусу індывідуальнага прадпрымальніка, моцна вырасла, таму з боку дзяржавы прыняты належныя меры. На сёння галоўнае — гэта стварыць умовы, у якіх ІП будуць разумець, як можна далей развівацца. Да таго ж, на думку МПЗ, пералік відаў эканамічнай дзейнасці павінен быць павялічаны.

### Па адрасе жылога фонду

Пра бонусы для ІП, якія вырашаць перайсці ў камерцыйную арганізацыю, расказала **начальнік упраўлення адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў Міністэрства юстыцыі Іна ЛЕУС.** «Па-першае, за рэгістрацыю такой камерцыйнай арганізацыі не трэба будзе выплачваць дзяржаўную пошліну. Можна будзе стварыць, у прынцыпе, любую камерцыйную арганізацыю, акрамя вытворчага кааператыва, бо там неабходна некалькі ўдзельнікаў», — патлумачыла Іна Леус. Паколькі ў Беларусі сёння найбольш зручнай формай ажыццяўлення бізнесу з'яўляецца таварыства з абмежаванай адказнасцю, мяркуецца, што большасць індывідуальных прадпрымальнікаў выберуць менавіта гэтую форму.

Варта ўлічваць, што цяпер мінімальныя памеры статутных фондаў прадугледжаны толькі для акцыянерных таварыстваў. Для таварыстваў з абмежаванай адказнасцю такі памер не прадугледжаны, адпаведна, ён вызначаецца самастойна індывідуальным прадпрымальнікам і фарміруецца на працягу года з дня дзяржаўнай рэгістрацыі данай камерцыйнай арганізацыі, лічыць Іна Леус.

Яшчэ дадатковы бонус, які прадугледжвае гэты закон, — тое, што месцам знаходжання камерцыйнай арганізацыі можа з'яўляцца жылое памяшканне. «Да апошняга часу жылое памяшканне можа з'яўляцца месцам знаходжання толькі ўнітарнага прадпрыемства і сялянскай фермерскай гаспадаркі. Цяпер жа і таварыствы з абмежаванай адказнасцю, якія ствараюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, змогуць быць зарэгістраваныя па адрасе жылога фонду», — запэўніла Іна Леус.

### Два гады без праверак

Пры гэтым плата за данае памяшканне застанецца такой жа, як і для фізічнай асобы, удакладніла **намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі Ірына БАБАЧОНАК.** Яна дадала, што пры пераходзе ІП у камерцыйную арганізацыю можна выкарыстоўваць усе раней атрыманыя дазволы, сертыфікаты і іншыя дакументы падобнага кшталту. Закон прадугледжвае права камерцыйнай арганізацыі карыстацца дакументамі, выдадзенымі на імя ІП на працягу года пасля яе рэгістрацыі. Пераафармленне дакументаў на працягу гэтага года праводзіцца бясплатна і па заяўным прынцыпе без дадатковых дакументаў.

Закон таксама ўстанаўлівае, што пасля перарэгістрацыі ў юрыдычную асобу новая арганізацыя можа карыстацца прэферэнцыямі на працягу сямі гадоў без уліку часу, які ўжо выкарыстаў ІП. Варта ўлічваць, што гэта датычыцца толькі тых прадпрымальнікаў, якія перарэгіструюцца ў юрыдычную асобу да 1 студзеня 2026 года. Калі камерцыйная арганізацыя будзе заснаваная пазней, то перыяд на карыстанне прэферэнцыямі юрыдычнай асобы будзе падсумоўвацца з перыядам карыстання імі ў якасці ІП.

**Паколькі ў Беларусі сёння найбольш зручнай формай ажыццяўлення бізнесу з'яўляецца таварыства з абмежаванай адказнасцю, мяркуецца, што большасць індывідуальных прадпрымальнікаў выберуць менавіта гэтую форму.**

І яшчэ. Новыя камерцыйныя арганізацыі, створаныя ІП, не будуць уключаць у план выбарачныя праверкі цягам двух гадоў з моманту іх узнікнення. Аднак калі праверкі ўжо былі пачаты або ІП быў уключаны ў спіс выбарачных праверак на момант стварэння юрыдычнай асобы, то яны ўсё ж пройдуць у дачыненні да гэтай новай арганізацыі, удакладніла Ірына Бабачонак.

Да дзейнасці камерцыйных арганізацый з колькасцю работнікаў да 50 чалавек будуць прымяняцца нормы і правілы, якія сёння існуюць для ІП ці мікраарганізацыі (калі такія асаблівасці ўстаноўлены заканадаўствам). Пры гэтым пры розніцы рэжымаў будзе выбірацца найбольш просты з пункту гледжання суб'екта гаспадарання.

Эксперт паведаміла, што ў пераліку дазволеных відаў дзейнасці для ІП застануцца розьнічны гандаль, паслугі па перавозцы пасажыраў, а таксама будаўнічыя работы, «якія не патрабуюць сур'ёзнай тэхналагічнай падрыхтоўкі».

### Колькі прыйдзецца плаціць?

Уносяцца змены ў сістэму дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і пашыраецца пералік асоб, якія ўдзельнічаюць у дадзенай сістэме. У цяперашні час індывідуальныя прадпрымальнікі і плацельшчыкі падатку на прафесійны даход абавязаны выплачваць узносы ў бюджэт фонду. «Пачынаючы з 1 кастрычніка да іх дадаюцца грамадзяне, якія ажыццяўляюць рамесную дзейнасць, і асобы,што выплачваюць рамесны збор і ажыццяўляюць дзейнасць у сферы аграэкатурызму», — адзначыла **намеснік кіраўніка фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына ЛІХАЧОВА.**

Паводле яе слоў, для гэтых катэгорый захоўваецца льгота па выплаце ўзносаў, калі яны з'яўляюцца атрымальнікамі пенсій. У іх ёсць толькі права добраахвотна аплачваць узносы.

Для індывідуальных прадпрымальнікаў будзе арганізаваны механізм аплаты ўзносаў у бюджэт фонду і парадак аплаты. Гэта значыць, узносы аплачваюцца ад устаноўленага імі даходу, але не ніжэй чым з памеру мінімальнай заработнай платы. Разам з тым узносы не выплачваюцца за перыяды, калі грамадзянін не ажыццяўляў прадпрымальніцкую дзейнасць.

Аплата ўзносаў будзе праводзіцца штогод, не пазней за 1 сакавіка года, наступнага за справаздачным. «Так, за 4-ы квартал 2024 года яны павінны будуць аплаціць узносы ў бюджэт фонду не пазней за 1 сакавіка 2025 года. Калі фізічная асоба ў нейкі перыяд не ажыццяўляла сваю дзейнасць, гэтыя перыяды павінны быць задэклараваны ў дакументах персаніфікаванага ўліку не пазней за 31 сакавіка года, наступнага за справаздачным», — удакладніла Кацярына Ліхачова.

### Як будзе пераафармляцца нерухомая маёмасць?

Пра гэта растлумачыла **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта маёмасці Кацярына ЛУК'ЯНАВА.** Для таго каб на камерцыйную арганізацыю з індывідуальнага прадпрымальніка была пераафармлена нерухомая маёмасць, ні прадпрымальніку, ні некамерцыйнай арганізацыі не трэба будзе прымаць ніякіх дадатковых дзеянняў і ажыццяўляць якія-небудзь аплаты.

Так, сістэма рэгістрацыі нерухомай маёмасці, якую ўзначальвае Дзяржкаммаёмасць, па выніках узаемадзеяння з сістэмай Міністэрства юстыцыі дае ІП магчымасць ажыццявіць усе неабходныя запісы аб праве ўласнасці і праве арэнды на зямельны ўчастак у дачыненні да новай створанай камерцыйнай арганізацыі самастойна. Гэта будзе першае падобнае рэалізаванае мерапрыемства ў сістэме рэгістрацыі нерухомасці. У аўтаматычным рэжыме сістэма рэгістра нерухомай маёмасці запытае і атрымае інфармацыю ў рэгістры юрыдычных асоб, заменіць інфармацыю і прывядзе яе да актуальнага стану без адпаведнай заявы патэнцыяльнага праваўладальніка. Кацярына Лук'янава дадала, што пасля гэтага прадстаўніку камерцыйнай арганізацыі, якая будзе створана, трэба звярнуцца ў любую тэрытарыяльную арганізацыю па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці.

У Мінску і ў кожнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы створана сваё агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Пры звароце прадстаўніка камерцыйнай арганізацыі будзе выдадзена апавяшчэнне аб унясенні выпраўленняў у дакумент адзінага дзяржаўнага рэгістра нерухомай маёмасці, праваў на яе і здзелак з ёй, што ў сукупнасці з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі права індывідуальнага прадпрымальніка на пэўны аб'ект нерухомай маёмасці будзе складаць правазасведчвальны дакумент.

Сяргей КУРКАЧ.

Малыя адрасы вялікага спорту

**Віктар РАМУЛЕВІЧ:**

# «СВАІХ СПАРТЫЎНЫХ ДЗЯЦЕЙ ТРЭБА ВЫХОЎВАЦЬ ЯК РОДНЫХ»

## Трэнер чэмпіёна і яго адказы на вечнае пытанне

**Размовы аб тым, што развіццю дзіцячага спорту трэба ўдзяляць не меншую ўвагу, чым вышэйшаму спартыўнаму звяну, не сціхнуць ніколі. У адных выпадках размовы так і застаюцца тэмамі нарад, у іншых атрымліваюць практычнае ўвасабленне. Свежыя ідэя, пошукі нестандартных варыянтаў і новыя падыходы — тое, што ў рабоце з дзецьмі, як і ў спорце, ніколі не страціць актуальнасці. Але існуе і традыцыйная формула, якая даказала свой плён. Вялікага сакрэту няма. І, каб яго спазнаць, далёка ехаць не трэба, у Ашмяны. Тут ужо пяць дзясяткаў гадоў выхоўваюць гандбалістаў. Разбяром ашмянскую формулу поспеху дэталёва.**



### ІНФРАСТРУКТУРА: АД ПЯЧНОГА АЦЯПЛЕННЯ ДА ПАЛАЦА

Ашмянская дзіцячая школа гандбола — найстарэйшая ў краіне, дзейнічае з 1964 года. Для разумення: у Беларусі гандбол развіваецца з другой паловы 1950-х гадоў. Спорту ўсяго дзясятак гадоў, а ў невялікім горадзе ўжо рыхтуюць рэзерв. Няцяжка здагадацца, што тады ўмовы былі далёка не самыя камфортныя: будучыя гандбалісты трэніраваліся ў невялікім падвальным памяшканні, у вокны якога былі відаць ногі прахожых, абагравалася гэтая «зала» звычайнай печчу, вароты былі адны, на другія проста не хапала месца. У цёплую пару ратавала вуліца. Сёння, натуральна, гэта дзіўна ўявіць, бо Ашмянская дзіцячаюнацкая спартыўная школа па гандболе дзейнічае на базе сучаснага і камфортнага фізкультурнааздараўленчага комплексу, адкрытага ў 2013 годзе. Аб'ект уключае камфортныя раздзявальні, прасторную светлую залу, трыбуны для гледачоў і ўсё, што трэба для спартсменаў і трэнераў.

### ДОСВЕД І ТРАДЫЦЫІ: УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ТРЭНЕРА

Самы важны і самы цікавы элемент. Наўрад ці б дзеці хадзілі займацца ў цесную залу, калі б трэнеры не маглі іх зацікавіць. І ў гэтым майстар Віктар Браніслававіч Рамулевіч — прадстаўнік першага пакалення беларускіх гандбалістаў, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, з працоўнай кніжцы якога адзін запіс «Ашмянская спартыўная школа», датаваны 1972 годам. З гэтым чалавекам неабходна пазнаёміцца бліжэй.

Пачалося ўсё са школьнай секцыі гандбола, якая замяніла секцыю валейбола. Што такое гандбол, у Ашмянах, канешне, ніхто не ведаў, але дзеці зацікавіліся. Затым у біяграфіі Віктара Рамулевіча была вучоба ў інстытуце фізкультуры і выступленне за каманду «Палітэхнік» — адзіную беларускую каманду, якая ў пачатку 1960-х удзельнічала ў вышэйшай лізе чэмпіянату СССР. «Гандбол толькі пачынаўся, і ніхто не ведаў, якім ён павінен быць. Мы гулялі, трэніраваліся, як умелі. Я са сваім ростам 1.73 выступаў за найлепшую каманду краіны. Сёння гандбалістаў ніжэй за два метры і не знойдзеш», — адзначае Віктар Браніслававіч. Гульнявая кар'ера Віктара Рамулевіча працягвалася ў Брэсцкім гандбольным клубе. Трапіў ён туды па запрашэнні Анатоля Мяшкова, чыё прозвішча носіць сёння клуб у горадзе над Бугам. «У Брэсце я прабыў тры месяцы, але жонка настаяла на вяртанні ў Ашмяны. Вярнуўся. Дома пачаў працаваць трэнерам. Тут не было ні футбола, ні валейбола, ніякіх іншых відаў спорту, таму дзеці на гандбол і пацягнуліся. Думаю, ім было са мной цікава. Бо я, ужо будучы трэнерам, пяць гадоў ездзіў у Мінск выступаць за СКА. У Ашмянах сам трэніраваўся і паралельна трэніраваў дзяцей. І мне гэта дапамагала, усе заданні, якія даваў дзецям, выконваў разам з імі», — успамінае Віктар Рамулевіч.



У гандбол у Ашмянах гулялі ўсе, хто хацеў. «Я не адмовіў нікому. Няхай сляпы, няхай глухі, няхай бязрукі — абы толькі быў заняты справай. Безумоўна, звяртаў увагу на рост, рукі, ногі. Рост у гандболе — фактар важны, але не заўсёды высокі гулец азначае добры гулец. Нават з невысокага хлопца можна выхаваць добрага гандбаліста, калі навучыць розуму. Вось я і вучыў. За ўсё жыццё ні аднаго чалавека з трэніроўкі не выгнаў, як бы дрэнна сябе ні паводзілі. Вельмі лёгка адбіць у дзіцяці жаданне і амаль немагчыма вярнуць яго. Асабліва шкадаваў дзяцей з няднабрандзейных сем'яў — яны адданыя і гатовыя біцца за каманду да апошняга. Выдатнікі, адораныя дзеці і на пляцоўцы добра разважаюць. Да кожнага свайго хлопца ставіўся з павагай. Але дысцыпліну трымаў жалезную, і сёння мае вучні, будучы ўжо дарослымі, пры мне не кураць, бо ведаюць, што, калі злаўлю, мала не здасца. Пры гэтым не лічу сябе жорсткім трэнерам, многае дарую», — разважае Віктар Браніслававіч.

Сучасныя дзеці, заўважае трэнер, далёка не такія, як былі раней, і зацікавіць іх спортам больш складана. Але рэальна. І першыя ў гэтым павінны быць школьныя настаўнікі фізкультуры. «Фізкультура — недаацэнены прадмет у школе, з яго ўсё пачынаецца. І настаўнікі фізкультуры павінны працаваць у цеснай звязцы з трэнерамі, яны ж першымі бачаць дзяцей і могуць адкрыць класнага спартсмена», — перакананы Віктар Рамулевіч. А далей ужо ўсё залежыць ад трэнера. Будзе трэнер сумленна працаваць — будзе вынік. Будзе трэнер сачкаваць — не будзе ніякага выніку, і тады не трэба вінаваціць спартсмена. Трэба ўмець знаходзіць кантакт з дзецьмі, выхоўваць сваіх спартыўных дзяцей як родных. І працаваць адказна. Я і сёння прыходжу на работу за паўгадзіны да трэніроўкі. Стаю ў вестыбюлі і гляджу, хто першы прыйшоў, хто — другі, хто — трэці. Вяду свой дзённік трэніровак, не той, які я абавязаны запаўняць (яго за дзве хвіліны запаўняю), а свой, дзе адзначаю і спазненні, і аб'ёмы работы, і дэталі трэніровак», — расказвае Віктар Браніслававіч. А яшчэ трэнер павінен разумець, што для спартсменаў галоўнае. Па словах Віктара Рамулевіча, для гандбалістаў гэта гульні: «Спартсменам для таго, каб развівацца, трэба пастаянна гуляць, гуляць і яшчэ раз гуляць. Адзін матч замяняе 10 трэніровак. Толькі так можна атрымаць належны досвед. І каманда загартоўваецца не на трэніроўках, а ў гульнях. Калі спартсмен не будзе згуляны з камандай, не будзе спарынгаў, — аб якім развіцці можна казаць?!». Аднак разам са спартсменам павінен расці і ўзровень каманды, і, адпаведна, узровень гульняў. У Ашмянах, як і ў любым раённым цэнтры, алімпійскага чэмпіёна не выхаваеш, заўважае Віктар Рамулевіч. Таму дзіцячыя трэнеры вымушаны аддаваць сваіх вучняў вышэй — у вучылішчы алімпійскага рэзерву, дарослыя каманды, і, калі ўсё будзе добра, — у нацыянальную зборную. Гэта ў ідэале. Але ў рэальнасці нярэдка здольныя гандбалісты з заканчэннем сярэдняй школы (і адпаведна ДЮСШ) губляюцца, забываюць пра гандбол або проста не маюць магчымасці рэалізаваць свае здольнасці. Праблема старая як свет... Для Ашмян, напэўна, не самая вострая, але адчувальная. Віктар Браніслававіч Рамулевіч і яшчэ адзін знакаміты мясцовы знакаміты трэнер Вера Аляксееўна Мальцава выхавалі нямала здольных гандбалістаў. Але нямала іх выхавальнікаў і ў спорце сябе не рэалізавалі. «Дзіцячы трэнер — няўдзячная праца. Але мы разумеем, што павінны выхаваць спартсмена і аддаць яго далей, каб ён развіваўся. Канешне, хочацца, каб усе мае вучні перамагалі, я больш за ўсё люблю перамагаць, імя Віктар абавязвае. Таму мае каманды часцей перамагаюць, чым прайграюць. І я гэтым ганаруся. А яшчэ тым, што мая праца не засталася незаўважанай. Я, вясковы трэнер, — заслужаны трэнер Беларусі, трэнер вышэйшай катэгорыі. Атрымліваецца, не дарма займаўся сваёй няўдзячнай працай, — дзеліцца Віктар Браніслававіч. І адразу здзіўляе: "Я працую трэнерам больш за 50 гадоў, больш за 15 гадоў я ўжо на пенсіі і ўсё роўна прыходжу ў залу. Можа, хопіць ужо працаваць? Вось у гэтым годзе выпушчу групу і буду заканчваць сваю трэнерскую кар'еру. У мяне такі сад цудоўны на 20 сотак, буду ім займацца».

### УЗОР ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ: ДАРОСЛЫЯ ПАВІННЫ ЗАЦІКАВІЦЬ ДЗЯЦЕЙ

Але пачуццё прысутнасці Бога было заўсёды. Яно ў кожнага ёсць. Нават калі расцеш у сям'і, дзе нічога не нагадвае пра Бога. У дзяцінстве, калі я ўпершыню ўбачыў царкву з крыжамі, задаўся пытаннем: што гэта такое? І бацькі расказалі мне, што ёсць вось такая з'ява. Дарэчы, тата, хаця знешне не дэманстраваў рэлігійнасці, вылічваў, калі будзе Вялікдзень, і фарбаваў яйкі. А ў крамах дзесьці блізка да свята з'яўляліся кулічы пад назвай «Кекс вясенні».

***— Як жа вы вырашылі паступіць у семінарыю?***

— У Бабруйску, куды пераехала наша сям'я, паступіў у медвучылішча і там зразумеў, што хачу быць у храме. Мяне туды цягнула. Аднойчы зайшоў у маленькі храм на вуліцы Шміта, і мяне там пахрысцілі. Ёсць такое паняцце, як заклікальная благадаць, калі адчуваеш блізкасць Бога і не бачыш ніякіх недахопаў у Царкве, якія там існуюць, дарэчы, як у любой з іншых арганізацый. Нічога гэтага не бачыш, а толькі самае добрае. У Жыровічы паехаў спачатку ў паломніцтва. І першы, каго я там сустрэў, быў айцец Сафроній — цяперашні архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі, а тады благачынны манастыра. Ён спытаў: «У семінарыю прыехаў паступаць?» Я тады пра гэта яшчэ не думаў, але потым забраў дакументы з медвучылішча і вярнуўся ў Жыровічы. Айцец Сафроній, можна сказаць, націснуў на кнопку. Цяпер вось працуем у адной вобласці. Ён архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі, а я епіскап Бабруйскі і Быхаўскі. Мы сустрэліся, калі ён ужо скончыў семінарыю, акадэмію, быў свяшчэннікам у Жыровіцкім манастыры, а мне споўнілася ўсяго 16 гадоў.

***— У семінарыі было цяжка пасля свецкага жыцця?***

— Я тады ўпершыню адарваўся ад дома, але на душы было лёгка. Старадаўняя Мінская духоўная семінарыя ў Жыровічах адрадзілася ў 1989 годзе. А я паступіў у яе ў 1990-м.

## ПАД КІРАЎНІЦТВАМ МІТРАПАЛІТА ФІЛАРЭТА

*Мінская духоўная семінарыя ў Свята-Успенскім манастыры ў Жыровічах была адкрыта па ініцыятыве мітрапаліта Філарэта. Ён чытаў там лекцыі па Новым Запавеце, быў адкрыты для зносін з семінарыстамі.*

— Гэта неверагодны чалавек, — кажа ўладыка. — Ён быў навуковым кіраўніком спачатку маёй дыпломнай работы, потым кандыдацкай. Можна напісаць цэлае сачыненне на тэму, як мітрапаліт Філарэт аказаўся вельмі блізкім чалавекам і адыграў вялікую ролю ў фарміраванні маім і многіх іншых свяшчэннікаў па ўсёй Беларусі. Ён быў вельмі ўважлівы, і мне было дзіўна, што чалавек настолькі заняты ўдзяляе табе, які яшчэ нічога сабой не ўяўляе, столькі ўвагі і клопату. У яго была загружанасць вар'яцкая. Яго тэлефон (дыскавы) званіў пастаянна. Прыйдзеш да яго пагаварыць, і гэта аказваецца немагчыма з-за пастаянных званкоў. Аднойчы мітрапаліт расказаў, што зайшоў у кабінет, а там — цішыня. Ён падумаў: як добра, ніхто не звоніць. Потым убачыў, што тэлефон не падключаны. Прыбіральшчыца выпадкова выцягнула провад.

***— У вашым альбоме ёсць фота, дзе вы з мітрапалітам Філарэтам у Грэцыі.***

— Пасля семінарыі я паехаў вучыцца ў Фесаланікійскі ўніверсітэт на тэалагічны факультэт. Мітрапаліт Філарэт адпраўляў студэнтаў на павышэнне кваліфікацыі. А яшчэ вучыўся на курсах англійскай мовы ў Бірмінгеме і ў Германіі — у Цюбінгене. Фесаланікі законны на выдатна, хаця ў Мінскай духоўнай семінарыі быў усяго толькі харавшчыкам.

***— За час вучобы ў Еўропе вы, напэўна, вельмі добра вывучылі асаблівасці праваслаўных традыцый за мяжой.***

— Калі вучыўся ў Грэцыі, у нас былі праваслаўныя студэнты з усяго свету: з Бразіліі, Вялікабрытаніі, Францыі, Егіпта, Германіі, Славакіі, Польшчы, Чэхіі, Сербіі, Румыніі, Лівана. Ва ўсіх адно богаслужэнне, тэксты тыя ж, але ёсць асаблівасці. У грэчаскіх храмах, напрыклад, ёсць стасідыі (адкідныя сядзенні), каб людзі маглі сядзець. У нашых царквах уздоўж сцен таксама ёсць на чым пасядзець, але ўдзельнічаць у богаслужэнні стоячы — гэта форма аскезы. Ты прыходзіш да свайго Нябеснага Айца, які цябе і накорміць, і напоіць, і суцешыць. У старажытнасці богаслужэбны Устаў прадпісваў, у якія моманты можна сядзець. Напрыклад, кафізма ў перакладзе з грэчаскага «сядзенне», таму ўсе сядзелі. Некаторыя трапары называюцца сядальны. А вось ёсць такое богаслужэнне, як акафіст. Што літаральна азначае не сядален — трэба стаяць. Адным словам, ва ўсіх народаў нейкія свае асаблівасці, але вера адна.

***— Куды вярнуліся пасля вучобы за мяжой? Як рэалізоўвалі атрыманы вопыт?***

— Працаваў выкладчыкам у семінарыі ў Жыровічах, потым у Інстытуце тэалогіі БДУ, які быў створаны мітрапалітам Філарэтам і дагэтуль існуе. Пад кіраўніцтвам мітрапаліта пісаў кандыдацкую на тэму «Вучэнне святога апостала Паўла аб адносінах чалавека да тварнага свету». Апостал Павел кажа, што ўсё тварэнне пасля грэхападзення чалавека пакутуе ад яго, шукае выратавання. І зноў такі праз чалавека. Я аналізаваў Стары і Новы Запаветы, пасланні Апостала і як гэта адбілася на служэнні ў Царкве.

## У ЦАРКВЫ І ДЗЯРЖАВЫ ЗАДАЧЫ АДНОЛЬКАВЫЯ

**— Сёлета ў сакавіку Прэзідэнт Беларусі прыняў удзел у пасяджэнні Сінода Беларускай праваслаўнай царквы. На сустрэчы ён адзначыў, што перад свяшчэннаслужыцелямі сёння стаяць такія ж задачы, як і перад дзяржавай: выхаванне асобы, захаванне міру, спрадвечных праваслаўных традыцый. Як удзельнік гэтага пасяджэння падзяліцеся думкамі пра сустрэчу.**

— Шмат хто цікавіцца, што і як там было. Я праглядзеў рэпартажы АНТ і БТ, якія вялі здымкі гэтай падзеі. Яны зрабілі вельмі добрыя паўнавартасныя рэпартажы. Там было паказана ўсё самае галоўнае, што адбывалася: і атмасфера перададзена, і ўсе галоўныя словы, якія там прагучалі. Цяжка нешта дадаць. Прэзідэнт, як заўсёды, быў шчыры, ён зацікаўлены ў тым, каб у Царкве ўсё было добра, каб яна развівалася, каб яе місія ў грамадстве была значнай, каб прыносіла карысць людзям. Як гісторык ён разумее ролю хрысціянства і Царквы ў жыцці грамадства.

***— Сённяшні свет, падаецца, настолькі складаны...***

— Час цяжкі. Першы ўдар нанёс ковід. Потым падзеі ва Украіне. Сваякі спрачаюцца, браты і сёстры адмаўляюцца размаўляць... Царква перадусім дзейнічае малітвай. У нас ёсць спецыяльныя малітвы, напісаныя на гэтую тэму, і яны ўзносяцца на кожным богаслужэнні. Малітва — галоўная зброя.

Наша епархія — а гэта 62 прыходы і 63 свяшчэннаслужыцелі — садзейнічае адраджэнню асобы і пераўтварэнню яе жыцця. Прыярытэтам нашай работы з'яўляецца выхаванне дзяцей і моладзі. Практычна пры кожным храме ёсць нядзельная школа, там адбываюцца розныя мерапрыемствы. Робіцца ўсё для таго, каб моладзь свабодна адчувала сябе ў храме. У епархіі дзейнічае пяць духоўна-асветніцкіх цэнтраў.

***— Летась работа аднаго з іх, што пры храме ў гонар Святой пакутніцы вялікай княгіні Елісаветы, дзе знаходзяцца пачатковыя класы бабруйскай гімназіі № 3, была адзначана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне»...***

— Ініцыятарам гэтага праекта быў протаіерэй Аляксій Канаплёў, які ўжо пайшоў з жыцця. Стаяла мэта стварыць не толькі школу з вывучэннем праваслаўных традыцый, але і арганізаваць праваслаўны цэнтр, які б прыцягнуў увагу дзяцей. Сёння тут, акрамя пачатковых класаў гімназіі, знаходзяцца нядзельная школа для дзяцей, вялікая бібліятэка, розныя гурткі. У пачатковых класах вучыцца болей чым 70 дзяцей, нядзельную школу наведваюць каля 130. Тут праходзяць лекторыі для моладзі і дарослых, розныя конкурсы, выстаўкі, спектаклі.

Што датычыцца гімназіі, то летась яна была названа ў гонар мітрапаліта Філарэта. Гэта старадаўняя гімназія, у цэнтры Бабруйска. Да рэвалюцыі яна называлася Аляксееўскай, у гонар цэсарэвіча Аляксея. Захаваўся нават будынак гімназіі. У Магілёўскай вобласці гэта адзіны прыклад, дзе пачатковыя класы дзяржаўнай навучальнай установы маюць праваслаўны ўхіл.

Я сустракаўся з першым наборам гэтай гімназіі, было цікава даведацца, як навучэнцы ў дарослым жыцці прыменяць атрыманыя веды. Яны абралі розныя спецыяльнасці, але духоўны стрыжань адчуваецца.

У нас заключаны дагавор з упраўленнем адукацыі Бабруйскага гарвыканкама, у адпаведнасці з якім праходзіць шмат мерапрыемстваў на працягу года са школьнікамі і моладдзю. Лекцыі, сустрэчы, рэгулярныя факультатывы. Наогул, дырэктары многіх школ зацікаўлены ў тым, каб у навучальным працэсе прысутнічала тэма праваслаўя, бо гэта станоўча ўплывае на дзяцей. Бацькі, свяшчэннікі, настаўнікі — усе разам мы здольны выхаваць годнага грамадзяніна нашай краіны, які шануе бацькоў, прытрымліваецца духоўных традыцый.

## «НАЗІРАЛЬНІК»

*Уладыка ўсміхаецца: менавіта так гучыць яго пасада ў перакладзе з грэчаскай.*

— Самая галоўная дзейнасць епіскапа як любога свяшчэннаслужыцеля — гэта, вядома, малітва, духоўнае жыццё і арганізацыя богаслужэння, — кажа ён. — А яшчэ кадравая палітыка, назіранне за станам нашых абшчын, прыходаў. Самы далёкі ад нас — Быхаўскі з яго шыкоўным Свята-Узнясенскім жаночым манастыром у Баркалабаве. Дзевяць гадоў таму храм Іаана Прадцечы ў Баркалабаве быў распісаны ў візантыйскім стылі і ўпрыгожаны пісанымі абразамі ў разных дубовых ківотах. Аўтар — таленавіты іканапісец, выкладчык Беларускай акадэміі мастацтваў Антон Бельскі атрымаў за гэту работу спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

У 2021 годзе манастыр адсвяткаваў свой 380-ы юбілей з дня заснавання. З 2007 года ён, лічы, адбудаваны наноў. Амаль увесь быў разбураны ў савецкі час. Акрамя Баркалабаўскага, у нас яшчэ два манастыры, якія таксама ў стадыі будаўніцтва. Адзін з іх побач з епархіяльным упраўленнем — у гонар Жанчын-міраносіц і мужчынскі ў Прошчы. Манастыр у Прошчы афіцыйна ўтвораны пазалетась, раней там было брацтва. У 2022 годзе манастыр у гонар абраза Божай маці «Жываносная крыніца» быў зацверджаны сінодамі Беларускай і Рускай праваслаўных цэркваў. Яго яшчэ называюць Прошчанская пустынь. Там ёсць крыніца, і людзі едуць да яе. Усё пачалося з таго, што ў 1990-я ў лесе быў пабudаваны храм, і мітрапаліт Філарэт асвяціў яго. Месца прыгожае, ціхае, адасобленае. Бывае, прыедзеш туды ў будны дзень, а там ужо стаяць машыны: і з беларускімі нумарамі з усіх рэгіёнаў, і з расійскімі. Цяпер у Прошчы рэканструюецца храм і брацкі корпус.

***— Але манахаў, наколькі ведаю, там няшмат.***

— Для лесу чатыры манахі — нядрэнны вынік. Усе яны з вышэйшай свецкай адукацыяй. Атрымліваюць духоўную. Вакол лес, але сумаваць няма калі. Там цэлы падворак, куры, агароды, цяпліцы. У гэты манастыр едуць людзі з вялікімі сямейнымі драмамі — з расколамі, невылечнымі хваробамі, канфліктамі з дзецьмі — і знаходзяць суцяшэнне, прасвятленне і ўмацаванне ў цяжкіх абставінах, а часам і параду, якая можа выправіць сітуацыю ў сям'і. Шмат выратаваных сем'яў. Хворага трэба падтрымліваць, і колькі выпадкаў бывае, калі чалавек папраўляецца. Знойдзецца адпаведны ўрач, умовы для лячэння, медыцынскія прэпараты.

***— А кажуць, што эпоха цудаў прайшла.***

— Цуды адбываюцца пастаянна. Мы звяртаемся да Бога, і яны здараюцца. Яшчэ калі вучыўся ў Грэцыі, не хапала часу падрыхтавацца да здачы экзамену. Немагчыма за тры дні прачытаць некалькі соцень старонак на грэчаскай мове. Заўсёды заставалася нешта, што недачытаў, недавучыў, недастаткова зразумеў. Маліўся і атрымліваў той білет, які ведаў. Ці гэта не цуд?

У людзей вельмі часта не хапае пачуцця ўдзячнасці за тое, што ёсць. У нас насамрэч усё ёсць. Калі чалавек працуе, вучыцца, ён мае ўсё. У нас сацыяльна-арыентаваная дзяржава, нікога не пакідае на вуліцы. І Царква таксама дапамагае ў цяжкіх жыццёвых сітуацыях. Ніхто ад голаду не памірае. Трэба за ўсё быць удзячным.

***— Згадала адно з вашых разважанняў у прэсе пра міласціну. Вы казалі пра спекуляцыю на пачуццях.***

— У прыходах вядзецца сацыяльная работа, і кожнага, хто мае ў чымсьці патрэбу, ведаюць. Дапамога аказваецца прадуктовымі наборамі, адзеннем. І стаяць каля храма з працягнутай рукой, насамрэч, няма патрэбы. Тыя, хто займаецца такой дзейнасцю, у пераважнай большасці — махляры. Гэта ценявы бізнес, эксплуатацыя добрых пачуццяў людзей. Просяць у бабулі, якая атрымлівае малую пенсію. А некаторыя нават патрабуюць. Бывае, клянуць.

ВЕЛІКОДНАЯ РАДАСЦЬ

***— У наш час адкрываюцца манастыры, будуюцца храмы. Гэта значыць, што вернікаў становіцца больш?***

— Храм — гэта памяшканне для хрысціянскай сям'і, абшчыны, якая там збіраецца, каб праявіць сябе як Царкву, каб здзяйсняць там Таінства духоўнае, Божую Еўхарыстыю, Тайную вячэру, якую запаведаў Хрыстос. Ён даў сваім вучням хлеб і віно, сказаўшы, што гэта Яго Цела і Кроў, і загадаў Прычашчацца ў Яго ўспамін. Каб мы былі ў Ім, а Ён — у нас. Для гэтага і сталі ствараццa храмы. У Бабруйску сёння 11 прыходаў з храмамі і манастыр. Аднаўляем сабор Аляксандра Неўскага. Ён амаль гатовы. Быў узарваны ў багаборніцкі час, ад яго амаль нічога не засталося. Георгіеўскі храм быў сталовай, Нікольскі — басейнам, Свята-Духаў — кінаклубам. Раней у Бабруйску існаваў маленькі храм, у святы трашчаў па швах, зайсці было немагчыма. На такі вялікі горад яго было мала. Сёння храмы не трашчаць, але ў нядзелю ўсе запоўнены. У будныя дні народу менш.

***— З класічнай літаратуры мы ведаем пра старцаў, ды і сёння можна пачуць расказы пра сустрэчы з імі. Ці ёсць яны на тэрыторыі епархіі?***

— У нас вельмі малады склад духавенства. Малады манах або свяшчэннаслужыцель таксама можа быць старцам, але часцей для гэтага патрэбен вопыт, а ён прыходзіць толькі з узростам. Самаму дарасламу з нашых клірыкаў 70 гадоў. Ён акармляе бабруйскую калонію, і да яго едуць пасля вызвалення.

***— Адраджэнне святынь патрабуе сродкаў. Хто вам дапамагае?***

— Пры епархіі створаны апякунскі савет, куды ўваходзяць кіраўнікі буйных прадпрыемстваў. Гэта не проста спонсары, гэта людзі, якія жывуць духоўным жыццём, для якіх Царква не на апошнім месцы і, акрамя сваёй асноўнай дзейнасці, якую яны робяць, дапамагаюць храмам, прыходам, свяшчэннікам, людзям.

***— Уладыка Серафім, напярэдзе святочных велікодных дні. Што ў іх самае галоўнае?***

— Радасць! У гэтыя дні самае галоўнае — больш радавацца! У нас будзе вялікі велікодны спектакль на Фаміну нядзелю — 12 мая — у бабруйскім Палацы мастацтваў. Запрашаем! Ён штогадовы і праводзіцца на высокім узроўні. Падобны ладзім яшчэ і на Раство. На сцэне падлеткі, дарослыя, нават кіраўнікі некаторых бабруйскіх прадпрыемстваў.

А яшчэ вельмі раю ўдзельнічаць у велікодных богаслужэннях. Яны асаблівыя, такія не паўтараюцца болей на працягу года. Таму важна браць у іх удзел. Гэта дае пачуццё неверагоднай радасці, чалавек перажывае духоўнае асвятленне. Калі вучыўся ў Грэцыі, спытаўся ў адной англічанкі, колькі ў іх працягваецца Вялікдзень. Яна сказала: адзін дзень. А ў нас 40 дзён асаблівага богаслужэння, велікоднай радасці!

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*г. Бабруйск.*



# Новы фармат велікодных традыцый

**Цэнтрам увагі свята рамеснікаў заўсёды з'яўляюцца велікодныя вербы і пісанкі, якія ўнесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Многія майстры прадставілі творы з новым бачаннем вялікага свята. Напрыклад, вербы, аформленыя саломкай альбо яйкі ў тэкстыльным упрыгожванні. Набываюць папулярнасць і велікодныя паштоўкі з элементамі выцінанкі альбо вышыўкі. Наведвальнікі кірмашу ахвотна ўдзельнічалі ў майстар-класах па роспісе яек і складанні гродзенскай вярбы.**

## На чарговы кірмаш у Гродна з'ехаліся майстры з усіх раёнаў вобласці

Неаднойчы даводзілася наведваць кірмашы майстроў народнай творчасці. Але тыя традыцыі, якія адроджаны з небыцця, асабліва прыцягваюць увагу. Таму ў першую чаргу накіроўваюся да жанчын, якія праводзяць майстар-класы. Каля пышных вербаў пазнаю **Дамініку КАВАЛЁНАК,** вельмі сталую жанчыну, якая з'яўляецца носьбітам элемента нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі «Выраб велікодных вербаў на тэрыторыі паўночна-заходняй Гродзеншчыны». Дамініка Дамінікаўна заўсёды ахвотна расказвае аб сваім захапленні.

— Калі пачалося адраджэнне хрысціянства ў 1980-х гадах, мы пачалі рабіць вербы не толькі для сябе, але і для іншых, — пачынае яна аповед. — Калі мяне пытаюць, колькі часу ідзе на выраб такой пальмы, я адказваю: год. Напачатку зёлкі трэба пасеяць, сабраць, высушыць, потым толькі — афарбоўка. Звычайна выкарыстоўваю кветкі, ярка пафарбаваныя, калоссі, зялёныя плёсткі, сухавейкі, як падказвае фантазія. Для мяне гэта вельмі пазітыўная работа. Не саджуся за яе, калі мне кепска, а толькі тады, калі настрой добры. Бо хачу, каб чалавеку выраб даў не толькі эстэтычную прыгажосць, але і душэўнае прасвятленне.

Ёсць у народнага майстра і аўтарская філасофская вярба, напоўненая сімваламі. Вось як тлумачыць іх Дамініка Кавалёнак:

— Тры галінкі вярбы — гэта дарога да Бога, тут мы бачым сэрца з калоссям — любоў да блізкіх і да сябе. А вось сімвалічны святлафор: на чырвоным святле спыніліся, на жоўтым падумалі, на зялёны пайшлі. Ідзём па дарозе да Бога з любоўю шукаць восьмы колер вясёлкі, бо сем колераў тут ужо ёсць. Гэты шлях і ёсць сэнс жыцця. Такая сімвалічная пальма.

**Навуковы супрацоўнік гродзенскага цэнтра рамёстваў «Спадчына» Алена ШЫДЛОЎСКАЯ** — адна з тых, хто вучыцца ў знакамітай майстрыхі. Самы складаны працэс, на яе думку, — падрыхтоўка кампанентаў вярбы. Трэба своечасова сабраць, высушыць, правільна захоўваць, каб не пайшла цвіль, каб зёлкі і кветкі не абсыпаліся. Праўда, тэрмін захавання такой вярбы —толькі год, потым, кажа Алена, букет трэба спаліць, а замест яго паставіць новы. Але ёсць і дэкаратыўныя вербы. Гэта ўжо сучасны варыянт старажытнага майстэрства. Напрыклад, майстар народных рамёстваў Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Ірына Шавельская і майстар народных промыслаў па саломапляценні Астравецкага цэнтра культуры і народнай творчасці Алена Малышава ўпрыгожваюць вербы саломкай. Атрымліваецца прыгожы букет, які нібы зіхаціць на сонцы. Такія вербы, як правіла, робяць для выставак. Праўда, элементы саломкі можна ўбачыць і на вербах, якія набываюць да свята.

А вось і знакамітыя пісанкі. **Майстар народных мастацкіх рамёстваў Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Ларыса КАСІЦКАЯ** працягвае традыцыі сапоцкінскай пісанкі. Самабытны роспіс велікодных яек захаваўся тут з даўніх часоў і ўваходзіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў як элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.



Пісанка — з'ява незвычайная. У руках майстрых простыя яйкі ператвараюцца ў твор мастацтва. Але для гэтага неабходна правесці падрыхтоўчую работу, расказвае Ларыса Касіцкая. Для прыгатавання фарбы, напрыклад, трэба два месяцы настойваць шышкі, кару дубу, альхі, іржавае жалеза. Прычым кару трэба браць падчас руху соку, бо інакш нічога не атрымаецца, яйкі будуць не чорныя, а шэрыя. Менавіта чорны колер робіць гэту тэхніку ўнікальнай.

На вараное яйка наносіцца вострай палачкай узор з натуральнага пчалінага воску, і тут трэба праявіць спрыт, бо воск хутка застывае. Узоры пры гэтым наносілі самыя розныя: хтосьці — больш простыя, хтосьці — складаныя. Потым яйка апускаецца на суткі ў фарбу — атрымаецца той самы чорны колер. Каб зняць воск, апускалі яйкі ў кіпень з шалупіннем цыбулі. Воск спаўзаў, а яйка набывала больш насычаны колер. Паралельна з пісанкай майстар па роспісе яек дэманструе такую традыцыю, як драпанка. Тут тэхніка прасцейшая. Напачатку яйкі варацца ў шалупінні цыбулі, а потым на іх драпаецца ўзор вострай металічнай палачкай.

— Цікавасць да старажытных традыцый расце, моладзь таксама захапляецца. Я вяду гурток выяўленчага мастацтва ў Азерскай сярэдняй школе, а малюнкі на паперы дапамагаюць затым і ў роспісе яек, — зазначае суразмоўніца. — Мы папулярызуем велікодныя традыцыі на ўсіх кірмашах, выстаўках, фестывалях, праводзім майстар-класы. Сёлета было вельмі шмат выездаў. Дэманстравалі роспіс яек на ВДНГ у Маскве падчас дзён Гродзенскай вобласці, былі ў Палацы Рэспублікі ў Мінску, рабілі майстар-клас для беларусаў замежжа, яны дзівіліся, што тут захоўваецца такая самабытная народная творчасць. Хутка будзем прымаць удзел у Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур у Гродне.



Дарэчы, тэма велікодных яек сёння атрымала сучаснае гучанне ў розных варыянтах. Напрыклад, кіраўнік гуртка па саломапляценні Лілія Амяльянчык прадставіла на кірмашы калекцыю яек, інкруставаных саломкай. Прычым наклейвае не толькі плоскія ўзоры, але і аб'ёмныя. Такімі яйкамі на стужках можна ўпрыгожыць пано альбо кошык падчас асвячэння велікодных яек.

Вельмі цікавая, на мой погляд, атрымалася калекцыя яек з тэкстыльным афармленнем, якую прывезла **майстар з Ваўкавыскага дома рамёстваў Жанна АБРАМЧУК.** Жанчына ахвотна дзеліцца сакрэтамі незвычайнай тэхнікі:

— Аснова ў мяне керамічная, яе поўнасцю абвязала простым узорам, затым вышыла гладдзю траву, рамонкі, прышыла пацеркі, бісер. Працэс даволі працаёмкі, тут толькі зялёнага колеру пятнаццаць адценняў. Вышывала тры дні. Для падстаўкі спляла вяночкі з галінак бярозы, упрыгожыла тэкстыльнымі шарыкамі.

Жанчыне падабаецца велікодная тэматыка. У гэтым кірунку яна прадставіла размаляваную калекцыю яек з сімвалічнымі ўзорамі — пеўнем, птушкамі, сонцам, кветкамі. Кажа, што з захапленнем вывучала народныя сімвалы, у якіх захоўваецца багатая спадчына і мудрасць продкаў. Гэтыя традыцыі перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Сёння майстры іх працягваюць, уносяць свой каларыт. Новым кірункам можна назваць велікодныя паштоўкі. Супрацоўнік Лідскага аддзела рамёстваў традыцыйнай культуры Дар'я Шафак — майстар па выцінанках. Сваю творчасць яна скіравала і на Вялікдзень. Робіць тэматычныя паштоўкі ў якасці сувеніраў.

**Наталля РАМАНОВІЧ, намеснік дырэктара Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці,** каментуе:

— Народныя промыслы развіваюцца дзякуючы ў тым ліку і такім кірмашам. Свята «Велікодны падарунак» праходзіць дзявяты раз. Гэта яшчэ і конкурс, на якім вызначаюцца пераможцы ў розных намінацыях: па вырабе вербаў, велікодных яек, паштовак. Майстры заахвочваюцца, спаборнічаюць. Апошнім часам зацікаўлена ў майстрах і народных промыслах мясцовая ўлада. З іх дапамогай адраджаем народныя абрады, у тым ліку і велікодныя. Такія святы — пляцоўка, дзе можна праявіць сябе і паказаць іншым. Відавочна, што гэта тэма атрымала шырокае распаўсюджванне ў самых розных відах тэхнікі. Нашы майстры па саломцы, напрыклад, прадставілі калекцыю яек, інкруставаных саломкай, гэта дэкаратыўнае мастацтва, можа быць прыгожым падарункам. У кожным раёне свая калекцыя, не падобная на іншую, а конкурс дазваляе ўдасканальваць майстэрства, далучаюцца новыя ўдзельнікі. Сёлета іх на кірмашы больш, чым летась. Разам з традыцыйнымі з'явіліся намінацыі па сучасным выкананні вербных букетаў, велікодных яек, паштовак і пано. У канцы мая мы прадставім творы нематэрыяльнай культурнай спадчыны — гродзенскую вярбу і сапоцкінскую пісанку — на «Велікодным букеце» ў Мінску.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# «МІХАСЁВЫ ПРЫГОДЫ» Ў КОЛАСАВЫМ ДОМЕ

## 6 чэрвеня ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа ў Мінску пройдзе фестываль дзіцячай кнігі

**Пра тое, якім будзе новае свята прыгожага пісьменства, і ішла гаворка напярэдадні ў Коласаўскім музеі. Варта нагадаць, што фестываль «Міхасёвы прыгоды» праводзіцца не ўпершыню, а стаў добрай традыцыяй вядучага літаратурнага музея краіны. Сярод арганізатараў адмысловага творчага праекта — Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», кнігарня «Акадэмкніга».**




— Па традыцыі падчас фестывалю, на які мы запрашаем школьнікаў, юных чытачоў і іх бацькоў, несумненна, будзе гучаць коласаўская тэма, — падзялілася меркаваннямі **дырэктар музея Ірына МАЦЯС**. — Адным з першых мерапрыемстваў стане сустрэча гасцей, удзельнікаў з унучкай пісьменніка Марыяй Міхайлаўнай Міцкевіч, якая шмат гадоў выступае ў друку па тэме коласазнаўства і якая раскажа пра сам Дом Коласа, пра сям'ю паэта, яго блізкае атачэнне, пра тое, якія жыццёвыя, грамадскія калізіі сталі асновай многіх твораў народнага песняра.

Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома **«Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** звярнуў увагу на тое, што ў апошнія тры-чатыры гады, у прыватнасці ў «Звяздзе», пабачыў шэраг кніг Якуба Коласа. Гэта — і чатыры выданні «Беларускіх народных казак у апрацоўцы Якуба Коласа», і дзве кнігі з раздзеламі з неўміручай паэмы «Новая зямля» — «Летнім часам» і «Каляды» з ілюстрацыямі таленавітага сучаснага кніжнага графіка Лізаветы Жванія, а таксама «Міхасёвы прыгоды», у афармленні якіх выкарыстаны ілюстрацыі мастака Анатоля Волкава да першага выдання паэмы. «Усе гэтыя выданні, якія, між іншым, даволі хутка разыходзяцца на беларускім кніжным рынку, — заўважыў Алесь Мікалаевіч, — мы абавязкова прадставім да ўвагі ўдзельнікаў фестывалю...»

**Дырэктар кнігарні «Акадэмкніга» Вольга ГЛУХОЎСКАЯ** адзначыла тое, што вопыт рэалізацыі кніг у іх краме паказвае: творы Якуба Коласа трэба часцей выдаваць масавымі тыражамі, у добрым мастацкім афармленні. Гэта варта рабіць з разлікам не толькі на юнага, але і на дарослага чытача.

На фестывалі «Міхасёвы прыгоды» аматараў чытання чакаюць сустрэчы з дзіцячымі пісьменнікамі Аленай Стэльмах, Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, Ірынай Карнаухавай, Міхасём Пазняковым, Валянцінай Драбышэўскай і іншымі паэтамі і празаікамі, якія большасць сваіх твораў адрасуюць хлопчыкам і дзяўчынкам. У праграме кніжнага свята па традыцыі — і сустрэча з кніжным графікам. Мяркуецца разгарнуць таксама выстаўку дзіцячых малюнкаў, прысвечаных творам сучасных дзіцячых пісьменнікаў Беларусі. Музейшчыкі, арганізатары фестывалю «Міхасёвы прыгоды» абяцаюць правесці на тэрыторыі музейнай сядзібы і цікавы літаратурны квэст. Каб прайсці яго паспяхова — трэба ўважліва зазірнуць у творы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

— Фестывалі дзіцячай кнігі, дзіцячага чытання — добрая традыцыя, — зазначыў на аргкамітэце чарговага коласаўскага свята Алесь Карлюкевіч. — Такія імпрэзы варта арганізоўваць і на іншых літаратурных, музейных пляцоўках, а таксама ў бібліятэках краіны. Яшчэ ніколі не праводзіўся фестываль «Палескія рабінзоны». Ды і кніжныя фестывалі, так ці інакш звязаныя з творчасцю Івана Сяркова, Міхася Лынькова, Міхася Зарэмбы на Гомельшчыне, Віцебшчыне, Лагойшчыне, вядома ж, дадалі б цікавасці да беларускага слова, беларускай літаратуры ў юных чытачоў краіны.

**Раман СЭРВАЧ.**

Нясумнае чытанне

# «З ДУШЫ ЎЦЯКАЛІ НЕДАВЕР І ЗМРОК, І ПЕСНЯЎ ВАЛАЧОБНІКАМ ХАПАЛА»

## Сем вершаў пра Вялікдзень

**«Радасць двайная ўсім хрысціянам і весялосць невымоўная свету дзеля свята, што сёння настала замест тугі таямніцы ранейшай. Гэтак, адправіўшы мужа ў дарогу, тужлівая жонка строгая з дзецьмі, але ж як вернецца муж нечакана — жонка весялосць невымоўную ўспрымае, і дзеці цешацца, абдораныя празмерна». Так паэтычна пачынаецца велікодная прамова святога Кірылы Тураўскага ў гонар свята, якое нашы продкі нездарма назвалі Вялікдзень — Уваскрэсенне Хрыстова. Не толькі ўзнёслыя словы прапаведзяў нарадзіў гэты дзень, але і радкі вершаў. Беларускія паэты знаходзілі непаўторныя вобразы, натхняючыся гэтым светлым святам... Давайце ж разам іх прачытаем.**

### «ЛЯЖАЛА ШЫНКА, ЯК КАДУШКА»

Надзвычай сакавіта апісана, як святкавалі беларускія сяляне сто гадоў таму Вялікдзень, у паэме, якую недарэмна называюць энцыклапедыяй беларускага жыцця, — «Новай зямлі» Якуба Коласа. Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч згадвае падрабязнасці ўласнага дзяцінства: як у вялікую суботу прыбіралі хату і двор, прыбіраліся і мыліся самі, перад тым як ехаць да споведзі ў царкву; як неслі асвячаць «велікодныя дары», паклаўшы ў «кашы, каробкі, паўасьміны». І як маленькі Костусь адчуваў — уся прырода чакае Вялікадня:

*«Звяры Вялікдзень чуюць, птушкі,*
*І хвоі гэтыя, і елі,*
*Ліхія людзі падабрэлі,*
*Бо святам Божым ўсюды вее;*
*З нажом разбойнік не пасмее*
*Залегчы ў лесе срэдзь дарогі,*
*Бо і заможны і убогі*
*Святы Вялікаднік святкуюць*
*І радасць ў сэрцы сваім чуюць».*

А вось і вярнулася сям'я з усяночнай, «абрусам белым стол накрыты»... Памаліліся, селі за стол, «І гуртам яйкі ачышчаюць // І па кусочку іх бяруць, // Крыху падсольваюць, ядуць...» Ну а стравы велікодныя Коласам апісаныя так, што слінкі цякуць у чытача: *«Ляжала шынка, як кадушка, // Румяна-белая пампушка, // Чырвона зверху, сакаўная, // Як бы агонь у ёй палае, // А ніз бялюткі, паркалёвы; // Кілбасы-скруткі, як падковы, // Між сцёган, сала і грудзінак // Красуе ўсмажаны падсвінак...»*

Карацей, як напрыканцы раздзелу зазначае аўтар,

*«Са смакам елі і багата —*
*На тое ж даў Бог людзям свята».*

### «ВЯСНА ЎЖО НА СВЕЦЕ, — ХРЫСТОС УВАСКРОС!»

Свой верш «Вялікдзень» Янка Купала напісаў у 1909 годзе, калі яшчэ наперадзе былі і перамога вызваленчага нацыянальнага руху, і ўзнікненне беларускай рэспублікі, і слава яе першага народнага паэта... Купала піша пра два святы: гэта Вялікдзень, Уваскрэсенне Хрыстова, і вясна — час адраджэння народа, сімвал вольнай, незалежнай Беларусі.

*«Два святы на свеце — ад ніваў да ніваў:*
*Хрыстос уваскрос! Наступае вясна!*
*Глянь смела, глянь вольна, шчасліў,*
*нешчаслівы.*
*І далей к жыццю з паніжэння і сна!*

*Гэй, гэй, на спатканне вялікіх двух святаў*
*Спяшыце супольна, хто ў путах не згніў!*
*Хай льюцца-зьліюцца ад хаты да хаты*
*У адно ўсе грамады, ўсе людзі ўсіх ніў!...*

*Вялікдзень! Вялікдзень! — ад нівы да нівы*
*Заводзіць бацькоў сваіх песеньку сын.*
*Зірні ж, азірніся, шчасліў, нешчаслівы,*
*І заўтра на поле да сох як адзін!*

*Дагэтуль мы плачам,*
*дагэтуль мы стогнем,*
*Адвечных не можам пазбыціся слёз...*
*Наперад па шчасце! Хай злое ўсё дрогне,*
*Вясна ўжо на свеце,— Хрыстос уваскрос!»*

### «Я БАЧУ, ЯК СВЯТЛЕЕ ТВОЙ ТВАР, МОЙ РОДНЫ КРАЮ»

Твор Купалы пра Вялікдзень стаў прычынай з'яўлення іншага твора. Радкі Купалы цытуе ў сваім вершы ў прозе «Хрыстос Уваскрос» Сяргей Палуян, малады крытык, які рана сышоў з жыцця, але паспеў праз свой літаратурны густ і гарачую любоў да Беларушчыны падтрымаць вартых аўтараў і вартыя творы.

*«Радуйся, мой родны краю! Надзея, як жывучая вада, льецца ў тваю душу. Скора і ты ўваскрэснеш ад доўгага мёртвага сну. Вясна прыйшла і для цябе. Хрыстос Уваскрос!»* — такім чынам, у вершы Сяргея Палуяна таксама побач з Уваскрэсеннем Хрыстовым гучыць тэма адраджэння народу.

*«Я бачу, як святлее твой твар, мой родны краю. І, поўны сілы і веры, я крычу ўва ўсю моц тваім нівам, лясам і балотам, тваім панурым вёскам, тваім пакрыўджаным сынам:*

*— З вялікім святам віншую! З вялікім святам, Вялікі Беларускі Народ!*

*— Хрыстос Уваскрос!»*



### «ІШЛІ ПА НЕБЕ ПРОДКІ, ЯК АБЛОКІ»

Рыгор Барадулін, таксама як і Колас, у творы пра Вялікдзень успамінае сваё дзяцінства. Як заўсёды, яго верш поўніцца сакавітымі беларускімі слоўцамі, падхопленымі на роднай Ушаччыне, ад маці Акуліны. Вялікдзень паэт называе на мясцовы манер Вялічкай:

*«Прыходзіла Вялічка на сяло*
*З чырвоным яйкам, з белатварым сырам,*
*І сцежку, паднядзеленую жвірам,*
*Світанне пугам за руку вяло.*
*Іграла сонца, ажывала тло,*
*Свянцонка пахла злагадаю, змірам.*
*І ўсім малечым вачаняткам шчырым*
*Прысмакаў досыць на стале было.*
*Расло святло, надзея ўваскрасала.*
*З душы ўцякалі недавер і змрок.*
*І песняў валачобнікам хапала.*
*І сніўся падарожжу сон далёкі.*
*І адвячорак позніўся знарок.*
*Ішлі па небе продкі, як аблокі».*

### «І МАМА ЛЮБІЛА ВЯЛІКДЗЕНЬ»

Шчымлівы верш Алеся Пісьмянкова «Велікодны ўспамін» прасякнуты не толькі радасцю, але і светлым сумам. Паэт успамінае сваю маці, медсястру Марыю Сямёнаўну, з якой калісьці заўсёды святкаваў гэты светлы дзень у родных Бялынкавічах, на Магілёўшчыне:



*«Я сёння, відаць, не засну —*
*Мой одум сірочы не знікне:*
*І мама чакала вясну,*
*І мама любіла Вялікдзень.*
*Звечара ў печы паліла,*
*Смажыла*
*Ды варыла.*
*Не гатавала,*
*А — чаравала,*
*Пры агні шчыравала.*
*Як сонца свяцілася ласкай*
*І грэла ўсіх любасць-спакой,*
*Якія ў Сямёнаўны пасхі!*
*Якія ў Сямёнаўны краскі.*
*Якую струну ні крану,*
*Зноў памяць балючая ўскрыкне:*
*Без мамы страчаю вясну,*
*Без мамы святкую Вялікдзень».*

### «УЗЫДУЦЬ КВЕТКІ ПРЫГАЖОСЦІ, ЯКАЯ ВЫРАТУЕ СВЕТ...»

Паэт Васіль Гадулька пры жыцці амаль нічога не надрукаваў, жыў на вёсцы, па рэдакцыях не хадзіў... Але яго вершы, якія захаваліся і былі апублікаваныя пасля смерці паэта, вельмі таленавітыя. Васіль Гадулька ўмеў угледзець у навакольным свет, бачыць мудрасць і прыгажосць прыроды. Вось як апісвае ён Вялікдзень:

*«Чаромхі куст расцвіў на ўзлеску.*
*У парку распусціўся бэз.*
*Прынёс Вялікдзень людзям вестку:*
*Хрыстос-пакутнік уваскрэс.*

*Як мар вясновы ў сэрцах росквіт,*
*як лепшай долі пасланцы,*
*куды ні глянь — пралескі ўроскід,*
*абапал сцежкі — дзьмухаўцы.*

*На радасць усяму ў прыродзе*
*па свеце крочыць белы май,*
*нагадвае: «Жывіце ў згодзе —*
*і там, дзе звіў гняздо адчай,*

*дзе блёкат хціваці і злосці*
*труціў пачуццяў першацвет,*
*узыдуць кветкі прыгажосці,*
*якая выратуе свет...»*

### «НАМ СОНЦА БУЛКАЙ ВЕЛІКОДНАЙ...»

Паэт Віктар Шніп таксама атаясамлівае гэтае светлае свята найперш са сваім вясковым дзяцінствам, калі хадзілі ад хаты да хаты з песнямі валачобнікі, калі маці, Ніна Міхайлаўна, пякла булкі, якія паэт параўноўвае з сонцам.

*«Вялікдзень — наш Вялікі Дзень.*
*Нам сонца булкай велікоднай*
*Плыве ў нябёсах, доўжыць цень*
*На сцежцы, што па вёсцы годна*
*Зноў валачобнікаў вядзе,*
*Што з песнямі ідуць святымі.*
*І ёсць Хрыстос сярод людзей*
*Нябачны, як агонь у дыме».*

Няхай жа Вялікдзень для ўсіх, хто святкуе, будзе сапраўды светлым днём, калі душа цягнецца да дабра, калі так шчымліва ўспамінаюцца бацькі, родныя мясціны... *«Цяпер сонца, красуючыся, да вышыняў узыходзіць і, радуючыся, зямлю саграе... Сёння вясна красуецца, ажыўляючы зямную прыроду, і бурныя вятры, што ціха павяваюць, плады памнажаюць, і зямля, што насенне жывіць, зялёную траву нараджае»*, — казаў святы Кірыла Тураўскі, прыпадабняючы гожай вясне — веру, а зіме — бязвер'е. Хай жа красуецца на нашай зямлі вясна!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Прэм'ера

# СМАРТФОНЫ, КАРЭТЫ, АТРУЧАНАЕ МАРОЖАНАЕ

## На сцэне тэатра імя М. Горкага — новая інтэрпрэтацыя п'есы Лермантава

Ці варта скрыжоўваць Лермантава і сучасны бязвік пра мафію казіно?

А чаму б не? На свой час Міхаіл Юр'евіч Лермантаў быў тым яшчэ скандальным хіпстарам, і ягоная драма «Маскарад» цалкам утрымлівае сюжэт для сучаснага серыяла. Так, дзвесце гадоў прайшло — а людзі і іх заганы не змяніліся... Але нюансы часу, натуральна ж, іншыя, змяніўся і глядач, і сам тэатр. Таму лагічна, што п'есу дваццацігадовага Лермантава паставіў таленавіты дваццацішасцігадовы рэжысёр Дэвід Разумаў, пераасэнсаваўшы ў сучасных рэаліях. На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага гэта ўжо другая пастаноўка маладога рэжысёра — першай быў «Фаўст», што даволі-такі сугучна, бо мефістофелеўшчына напоўніцу прысутнічае і ў «Маскарадзе» (асабліва ў асобе гульнявога мафіёзі князя Казарына (Аляксей Качан), іх дуэт з былым паплечнікам Арбеніным (Андрэй Сенькін) часам так і нагадвае Мефістофеля і Фаўста).

Калі ўдумацца, чалавек эпохі інстаграму дзіўна паралеліць з чалавекам эпохі свецкіх салонаў і баляў. Тая ж самая залежнасць ад меркавання незнаёмых абыякавых людзей, тая ж самая прага стварыць імідж, прыцягнуць увагу, сабраць лайкі... Толькі замест пастоў у інтэрнэце — ліставанне на паперы і чуткі, што пераказваюць на вуха, таму навіны даходзяць даўжэй.

Але ў пастаноўцы Дэвіда Разумава героі маюць смартфоны ды іншыя гаджэты (гледачы дружна весяляцца, калі герой па смартфоне выклікае карэту). Іх касцюмы — сінтэз хіпстарскіх і старарасвецкіх, мова — сінтэз вершаваных лермантаўскіх радкоў і вольнага пераказу, музыка — сінтэз класікі і року. А вось сутнасць натоўпу не змяняецца: гэта ўсё тыя ж бяздушныя манекены, якія займаюць цэнтр сцэны, падштурхоўваюць да тых ці іншых учынкаў проста сваёй злавеснай прысутнасцю. Не мае значэння, гэта аўдыторыя інстаграмаўскага блогу альбо свецкая публіка. Яны па сутнасці сваёй — нішто, пустэча, тым крыўдней, што іх уплыў такі згубны. Іх мэта — задаволіць цікаўнасць за кошт іншага.

Ну, і героі гэтую халодную цікаўнасць задавальняюць напоўніцу. Андрэй Сенькін стварыў выдатнага Арбеніна. Гэта і герой сучаснага серыяла, былы гулец, які выйшаў на спакой з гульнёвай мафіі, і арыстакрат лермантаўскай эпохі, бунтар-мізантроп. Спрадвечная тэма яшчэ ад часоў рыцарскіх раманаў: расчараваны ў жыцці злодзей у адстаўцы знаходзіць ратунак у наіўнай шчырай дзяўчыне. Толькі Ніна Арбеніна (выдатная работа Алены Стацэнка) таксама эвалюцыянавала за дзвесце гадоў: яна цяпер не проста ахвяра, рахманая авечка, якая, як што, траціць прытомнасць (а самі паспрабуйце пахадзіць-падыхаць у тугіх гарсэтах). Яна і голас можа павысіць на мужа-гульнямана, і псіхануць — як сапраўдная кабета, і, не сказаўшы мужу, сцягацца ў клуб... А мужгульняман, які пабагацеў няправедным шляхам, усё абяцае, што выправіцца, не сарвецца, і, зразумела, зрываецца. Ён так лёгка верыць у здраду Ніны, бо да канца ёй не верыць. Ну як яна можа быць такой чыстай, як яна можа яго, такога бруднага, шчыра любіць?



Крывавы дождж з мёртвых Нін, якія плюхаюцца на сцэну, гіпербалізуе драму да абсурду... Дарэчы, галоўны цэнзар Бенкендорф змушаў Лермантава некалькі разоў перапісваць п'есу з-за безнадзейнага фіналу. І малады беларускі рэжысёр прапануе свой фінал: пад знакаміты вальс Хачатурана час адкручваецца назад. Ажывае Ніна, затухаюць спрэчкі, знікае Невядомы (Сяргей Пракопіч), не адпомсціўшы Арбеніну, вяртаюцца назад прайграныя грошы істэрычнага князя-хіпстара Звездзіча (Кірыл Нікіцін), паўстае Арбенін перад спакусай: ісці ці не ісці ў гульнявы дом...

Не ідзе. Абірае сям'ю.

Увесь эпізод з адкручваннем падзей вельмі прыгожы, дынамічны, напружанне трагедыі змяняецца слязамі палёгкі... І галоўнае — вельмі нечаканы. І зусім іншы, светла-шчымлівы, прысмак застаецца пасля спектакля.

Можна ўявіць, што сучасная сям'я, у якой цяжкасці са зносінамі, прыйшла да псіхолага, і ім прапанавалі сеанс арт-тэрапіі... Пражылі падзеі пэўным чынам, упэўніліся, што так нельга... Прапрацавалі комплексы, памірыліся, асэнсавалі. Бо выснова не новая — трэба ўмець слухаць адзін аднаго і выказвацца да канца, не ўтойваць крыўды і падазрэнні. Тады і не давядзецца спажываць атручанае марожанае.

Калісьці дачка пісала Гётэ, аўтару «Фаўста»: «Схадзілі ў тэатр. Удалося паплакаць».

На гэтым спектаклі гледачам удаецца паплакаць. Удаецца і пасмяяцца. Усе адзначылі выдатную ігру Андрэя Сенькіна, якога, можа, некаторыя ў ролі змрочна-жарснага Арбеніна і не ўяўлялі. Цяпер цяжка будзе ўявіць гэтага героя іншым. Цікавае вырашэнне вобразаў Ніны Арбенінай (Алена Стацэнка) і Ганны Штраль (Віталіна Більдзюк), што падсунула згубены Нінай бранзалет князю Звездзічу: часам мы бачым, наколькі гэтыя жанчыны падобныя, як люстраныя адбіткі. Але іх дуалізм складанейшы, чым чорнае-белае, Адэта-Адылія: ніводная да канца не зладзейка, ніводная да канца не бязвінная ахвяра... Тут хіба што Казарын адназначны злодзей — такая вось у яго маска. Увогуле, у спектаклі ёсць што разгадваць у сэнсе алюзій. Схадзіце, складзіце ўласнае меркаванне.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# Клара збіралася жыць

## Чаму не нарадзіўся яе сын, распавядае спектакль Маладзёжнага тэатра

**Хлопец з'яўляецца ў пэўным пункце горада — ён ведае, што гэта Мінск, і спрабуе зразумець, што не дазволіла яго бацькам быць разам? Калі мастак Лёва з'ехаў у Маскву, даведаўшыся, што стане татам, то Клара вырашыла нараджаць, нягледзячы на хворае сэрца і тое, што ад яго сям'і пачула: «Вы не нашы людзі». Але менавіта тут, у гэтым месцы Ніжняга горада, дзе ад вятроў калісьці захінаў глыбокі яр, усе з'ядналіся: яго мама з сястрычкамі; беларуская жанчына і яе ненароджанае дзіця; вядомы мастак, які праз шмат гадоў прыходзіць сюды штодня, каб размаўляць з блізкімі, якіх страціў. Яны адгукаюцца — вусцішна гучаць прыглушаныя галасы, іх вельмі шмат! Шапочуць, трызняць, а то і папракаюць, што ён (яна, яны?) не мае права на гэтае месца. Прынамсі, Леў для іх здраднік: з'ехаў, кінуў, не вярнуўся, не быў побач з роднымі ў той самы страшны момант, не ляжыць разам з імі ў гэтай яме. Ад такога спыняецца сэрца...**

Спектакль «Тут была Клара» з'явіўся ў афішы Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра па волі рэжысёра Тацяны Аксёнкінай. Ён асаблівы ў афішы тэатра і адметны сярод пастановак самой Тацяны як па тэме, так і па форме. Яна рассунула межы сцэнічнай пляцоўкі і здолела стварыць прастору, дзе мінулае яднаецца з цяперашнім часам — свайго роду партал для кантактаў паміж тымі, хто жыў у Мінску больш як 80 гадоў таму, і тымі, для каго гэты горад з'яўляецца домам цяпер. Гэта і прастора для дыялогу паміж рознымі народамі, што насялялі горад, паміж рознымі пакаленнямі, сем'ямі, асобамі... А яшчэ паміж жывымі і тымі, хто ніколі так і не народзіцца. Такое немагчыма ў рэальным жыцці. Але тэатр можа прапанаваць звышрэальнасць. Ён можа выклікаць душы памерлых і ўвасобіць іх у персанажах, якія прамаўляюць і дзейнічаюць. Не трэба ніякай містыкі! Толькі ўвасобленае ўяўленне, мадэль магчымага. Тэатральная метафізіка. Бо гэтае мастацтва можа не толькі распавесці пра трагедыю, але і прымусіць перажыць яе — спачатку на ўзроўні герояў, а пасля на ўзроўні мінулага ўласнай сям'і, блізкіх людзей ці далёкіх, успаміны пра якіх адгукаюцца болем. У гэтым спектаклі падчас асобных сцэн ды эпізодаў падключаецца ўласнае мысленне гледача: каб дабудоўваць, здагадвацца і злучыць усё ў адзіную гісторыю. Нешта персанальнае, інтымнае: ён, яна, будучае дзіця, боязь яго нараджэння праз хваробу маці. Ёсць экзістэнцыяльны выбар — кожны з закаханых робіць яго.

Але інтымнае сягае далей. Да агульначалавечага. Калі суадносім асабісты канфлікт герояў з інфармацыяй пра тое, што ўрачыстае адкрыццё Камсамольскага возера запланавана на 22 чэрвеня 1941 года. О, Божухна, яна не ведае, чаго сапраўды трэба баяцца... Далей экзістэнцыя асобы ўзмацняецца шматкроць — праз экзістэнцыю народа, вось толькі ў яго не было выбару... Перажыванні за герояў і ўсе веды пра мінуўшчыну, любоў да горада, у якім жывеш, думкі пра тых, хто яго насяляў і сілкаваў сваёй энергіяй, раптам злучаюцца і ўтвараюць выбух эмоцый. Тэатр можа пераварочваць душу.

